НЕ ДЛЯ ПАДРУЧНІКА ГІСТОРЫІ 13

НЕЧАКАНА МАРОЗНЫЯ МАЙСКІЯ НОЧЫ 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

5 МАЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 85 (29965)

СЁННЯ Ў БЕЛАРУСІ АДЗНАЧАЕЦЦА ДЗЕНЬ ДРУКУ. СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ГАЛІНЫ ПАВІНШАВАЎ ПРЭЗІДЭНТ КРАІНЫ

«Гэтае свята аб'ядноўвае тысячы захопленых і творчых майстроў друкаванага слова — прадаўжальнікаў нацыянальных традыцый журналістыкі і асветы», — гаворыцца ў віншаванні.

«Прыгажосцю мовы і сілай таленту ў сучасным патоку падзей і фактаў вы дапамагаеце вылучыць галоўнае, зноў і зноў адкрываючы людзям свет інфармацыі, аналітыкі, даведачнай і мастацкай літаратуры, у якім пераплецены веды і мудрасць пакаленняў.

Кожная ваша публікацыя або выдавецкі праект уносіць свой уклад у развіццё грамадства, умацаванне дзяржаўнасці і маральных арыенціраў».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў работнікам і ветэранам галіны за адданасць прафесіі, прынцыповую грамадзянскую пазіцыю, адкрытасць і аб'ектыўнасць і пажадаў моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, натхнення і працоўных поспехаў.

Да роднага берага

Гэтых двух Рыгораў — ШВАБА і ТУРАЎЦА — я сустрэў у дзень сёлетняй Радаўніцы на беразе Прыпяці каля былой вёскі Ломыш Хойніцкага раёна — на маторцы цёзкі прыплылі з Нароўлі і робяць гэта ўжо болей за трыццаць гадоў (!). Атрымліваюць адмысловы дазвол на спуск лодкі на ваду і за шэсць кіламетраў (сёлета Прыпяць шырока разлілася і затапіла поймы) перапраўляюцца на родны бераг. Мінула болей за тры дзесяцігоддзі, як іх малая радзіма, пацярпелая ад наступстваў аварыі на ЧАЭС, абязлюдзела, але па-ранейшаму кліча і прыцягвае да сваіх берагоў. Яшчэ да трагедыі і Рыгор Шваб, і Рыгор Туравец ужо працавалі ў суседнім райцэнтры і кожны дзень дабіраліся водным шляхам да месца працы, а калі вёску ў пачатку дзевяностых перасялілі, яны засталіся ў Нароўлі назаўсёды. Рыгор Туравец працуе ў сферы культуры, Рыгор Шваб быў рыбаком у арцелі. Ад землякоў пачуў, што імя Рыгор было ў вёсцы самым папулярным, лічы, праз хату жылі мужчыны з такім імем, а самым папулярным заняткам у ламышоўскіх Рыгораў заўсёды было рыбалоўства.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- **Каля 1,5 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны жыве ў Беларусі. Самаму старэйшаму ўдзельніку ВАВ, які пражывае ў сталіцы, — 103 гады.**
- ТІБА-2023 наведалі больш за 56 тысяч чалавек.
- **Працягласць газавых сетак у Беларусі за 20 гадоў павялічылася ўтрая.**
- Адкрыта акрэдытацыя на тэставыя спаборніцтвы да II Гульняў краін СНД.

II ИГРЫ СТРАН СНГ БЕЛАРУСЬ 2023

- **Мемарыяльную дошку ў памяць пра разведчыка і Героя Савецкага Саюза Льва Маневіча адкрылі ў Магілёве.**
- Кабінет камп'ютарнай тамаграфіі пачаў працаваць у Ляхавіцкай райбальніцы.

Відавочца Перамогі

Сумесны праект «Звязды» з Магілёўскай абласной арганізацыяй ветэранаў

ВАЕННАЯ ПЕРАДАВАЯ ПАРТЫЗАНА МІХАІЛА ЦІТОВА

Ён з пакалення тых людзей, чыя маладосць прыйшлася на 40-я гады мінулага стагоддзя. Вайна прымусіла іх хутка пасталець, узяць на сябе адказнасць за лёс пакінутых без кармільцаў сямей, а кагосьці — стаць героем. Міхаіл Цітоў з іх ліку. Юнаму партызану і чырвонаармейцу прыходзілася неаднойчы глядзець смерці ў твар. Але лёс быў да яго добразычлівы.

ВАЙНА ПАД СТРЭХАМІ

Першы дзень вайны супаў з першым працоўным днём 14-гадовага Міхаіла. Каб унук лета не праводзіў дарэмна, дзед Парфірый уключыў яго ў брыгаду па разметцы Дняпра. Дзень быў ціхі і цёплы, успамінае ветэран. Спачатку яны на параходзе спусціліся па Дняпры да Буйніч. І адтуль пачалі ставіць слупочкі ў кірунку Дашкаўкі.

СТАР. 4

Гарадское асяроддзе

Прыгажосць — і спакуса, і паратунак

Цюльпаны-цёзкі адмірала і легендарнага прыродазнаўца, геаметрыя на клумбе і фокус на класіку... У Гомелі стылявыя праявы ландшафтнай архітэктуры запрашае ацаніць новы экскурсійны маршрут-знаёмства з батанічным помнікам прыроды — паркам Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. На майскай хвалі ён — адна суцэльная пляцоўка колеравай тэрапіі. Колькасць гараджан, каго спакусіла гэтая прыгажосць, — уражвае.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Камунальныя стасункі

ЭКАЛАГІЧНАЯ БЯСПЕКА — НАЦЫЯНАЛЬНЫ БРЭНД

Сенатары абмеркавалі, як у Беларусі наладжана работа з адходамі

Да 2035 года ў краіне павінна перапрацоўвацца 90 % адходаў, якія ствараюцца (у выглядзе другасных матэрыяльных рэсурсаў і сыравіны для кампаставання), для чаго ў краіне ўзвядуць 30 рэгіянальных комплексаў па абыходжанні з адходамі (цяпер працуе восем). Смеццевых палігонаў застанецца толькі 30 на ўсю краіну (цяпер іх 161). Удзельнікі пасяджэння экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі на чале са старшынёй Наталлі Качанавай у Баранавічах разгледзелі, як у горадзе арганізаваны збор адходаў ад насельніцтва, як яны перапрацоўваюцца і якая прадукцыя ствараецца з атрыманай сыравіны.

Экалагічны дабрабыт

Перад мерапрыемствам члены Савета Рэспублікі наведалі пункт прыёму (нарыхтоўкі) другасных матэрыяльных рэсурсаў і сартавальна-перагрузачную станцыю. Апошняя была збудавана ў 2011 годзе, прапускная здольнасць складала 30 тысяч тон адходаў за год, і аб'ект ужо меў патрэбу ў мадэрнізацыі, таму ў 2021-м пачалася яе рэканструкцыя, расказаў **Максім САСІН, намеснік генеральнага дырэктара Баранавіцкай гарадской ЖКГ па добраўпарадкаванні і будаўніцтве:**

— Мадэрнізаваная станцыя ўведзена ў эксплуатацыю ў сакавіку 2023-га, яе магутнасць узрасла да 75 тысяч тон у год, устаноўлены дзве новыя лініі: сартавання адходаў і дасартавання адходаў раздзельнага збору. Да рэканструкцыі з адходаў на станцыі вымалася каля 6 % другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), цяпер — каля 8 %, а ў планах — выйсці на адбор 10 % ДМР з агульнага аб'ёму адходаў.

Цяпер станцыя стала адным з васьмі працоўных рэгіянальных комплексаў па абыходжанні з адходамі, дзе перапрацоўваецца смецце не толькі з Баранавічаў, але і з Баранавіцкага, Ляхавіцкага і Ганцавіцкага раёнаў. У гаспадарцы станцыі — не толькі машыны для вывазу адходаў з прыватных падворкаў і шматкватэрнага жылля, але і спецыяльнае аўто — так званы пункт прыёму другаснай сыравіны ад юрыдычных асоб, а таксама мультыліфт — для вывазу адпрацаваных адходаў непасрэдна на палігон. У горадзе, дарэчы, завараны ўжо ўсе смеццеправоды, практычна ўсе шматкватэрныя дамы і 40 % прыватных падворкаў аснашчаны кантэйнерамі для збору цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) і другаснай сыравіны.

Пры арганізацыі работы з адходамі трэба выходзіць з забеспячэння аховы навакольля і рацыянальнага прыродакарыстання, бо гэта дазваляе захаваць значную частку натуральных прыродных комплексаў і забяспечыць экалагічны дабрабыт нашых тэрыторый, абазначыла **Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі**, прыярытэтныя кірункі дзяржпалітыкі ў гэтай сферы:

— Наша краіна дасягнула сур'ёзных вынікаў у навядзенні парадку і добраўпрадкаванні тэрыторый. Сёння гэта пазітыўны імідж, якім мы ганарымся. Чысціня прыроды і экалагічная бяспека — гэта ўжо, па сутнасці, нацыянальны брэнд. Сёння ў краіне дзейнічае салідная прававая база ў галіне абыходжання з адходамі, і мы не першы год працуем па гэтай сістэме. Іншая справа, што трэба працаваць хутчэй і больш эфектыўна.

Пры гэтым павінна быць эканамічная мэтазгоднасць у рабоце, а прадукцыя, што выпускаецца з перапрацаванай сыравіны, мусіць быць канкурэнтаздольнай, падкрэслілі ўдзельнікі пасяджэння. Зараз у краіне з выкарыстаннем перапрацаванай сыравіны вырабляюцца і сродкі гігіены, і новыя пластыкавыя вырабы, і вулічная плітка і пакрыцці, актыўна асвойваецца тэхналогія кампаставання. Вялікі запас для выкарыстання — і ў адходах ад прадпрыемстваў.

Для ўдасканальвання выкарыстання адходаў

У Беларусі штогод ствараецца каля 4 млн тон камунальных адходаў, больш за 80 % якіх «вырабляе» насельніцтва, астатняе — адходы прадпрыемстваў. Прымаючы рашэнні па абыходжанні з адходамі, нельга выбіраць паміж аховай навакольля і рацыянальным прыродакарыстаннем, з аднаго боку, і эканомікай — з другога, заўважыла Наталля Качанава:

— Трэба зрабіць так, каб экалагічныя меры сталі крыніцай даходаў і прыносілі прыбытак. Неабходна максімальна выкарыстоўваць унутраныя рэсурсы, у тым ліку і адходы. Бягучыя геапалітычныя рэаліі і глабальнае эканамічнае становішча падштурхоўваюць нас да паскоранага развіцця ў сферы абыходжання з адходамі: укаранення «зялёных» тэхналогій, вытворчасцяў замкнёнага цыкла, кааперацыі з прадстаўнікамі навуковай супольнасці.

Каб сістэма абыходжання з адходамі працавала больш эфектыўна, трэба максімальна ўцягваць у абарот другасныя рэсурсы, навесці парадак на аб'ектах захавання адходаў і ўдасканаліць сістэму абарачэння з ЦКА, расказаў **Андрэй ХМЕЛЬ, міністр ЖКГ:**

— Летась у краіне сабрана амаль 802 тысячы ДМР, што амаль на 10 тысяч тон перавышае заданне. Цяпер у краіне збіраецца амаль 96 % паперы, амаль 70 % шкла, неабходна паскарацца ў зборы палімераў. Колькасць сартавальных заводаў у краіне павінна быць роўнай колькасці палігонаў — у Беларусі будзе па 30 такіх аб'ектаў. Ужо дзейнічаюць аб'екты па сартаванні ў Брэсце і Гродне. У апошнім, дарэчы, будзе рэалізаваны праект па выкарыстанні РДФ-паліва для спальвання яго на цэментным заводзе ў Краснасельску, і да 2025 года тут будзе дасягнуты паказчык выкарыстання больш як 64 % ЦКА. Завяршаецца будаўніцтва сартавальных комплексаў у Оршы, Бабруйску. Сёлета пачнецца будаўніцтва такіх аб'ектаў у Гомелі і Ваўкавыску. Самы буйны (магутнасцю 400 тысяч тон) будзе збудаваны ў Мінску. Да 2025 года ў краіне павінна выкарыстоўвацца 64 % ЦКА (зараз 32 %).

Існуюць праблемныя пытанні ў арганізацыі збору камунальных адходаў, у прыватнасці па забеспячэнні кантэйнерамі, арганізацыі ўтрымання палігонаў. Ёсць пытанні і па закупцы тэхнікі, і па фінансаванні будаўніцтва сартавальных комплексаў, але з часам усё гэта будзе вырашана, дадаў міністр.

Узровень вымання ДМР з камунальных адходаў узрос у 1,6 раза. Фактычна гэта другасная сыравіна, якая выкарыстоўваецца для вырабу прадукцыі. І дзяржава робіць усё, каб падтрымліваць вытворцаў, якія выкарыстоўваюць ДМР, **заўважыў Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

— За пяцігоддзе ў краіне закрыты амаль усе міні-палігоны, наведзены парадак па вытрымліванні тэхналогій. Такім чынам, пастаянна павялічваецца ўцягванне ЦКА ў эканоміку Беларусі. Сёння найбольшы працэнт вымання другаснай сыравіны з адходаў у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях, але ёсць яшчэ вялікі рэзерв па краіне ў гэтым кірунку.

Па выніках пасяджэння выпрацуюць стратэгію і прапановы далейшага развіцця галіны абыходжання з адходамі, якія будуць разгледжаны парламентарыямі падчас работы над адпаведнымі экалагічнымі законапраектамі.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кітаі апублікавалі даклад аб арганізацыі ЦРУ «каляровых рэвалюцый» і кібератак

Даклад апублікаваны кітайскім Нацыянальным цэнтрам рэагавання на камп'ютарныя вірусы і кампаніяй «360», якая займаецца кібербяспекай, паведаміла ТАСС. Згодна з дакладам, у Злучаных Штатах было створана праграмнае забеспячэнне, якое не патрабуе тэлефоннага або спадарожнікавага падключэння. Яно можа быць утоена ад любой формы дзяржаўнага назірання. Дзякуючы гэтай тэхналогіі ЦРУ ўдалося арганізаваць значную колькасць «каляровых рэвалюцый» у розных краінах свету. «На працягу доўгага часу ЦРУ ЗША таемна ажыццяўляла «мірную эвалюцыю» і «каляровыя рэвалюцыі» па ўсім свеце, а таксама працягвала займацца шпіянажам і крадзяжом даных», — адзначаецца ў дакладзе. У прыватнасці, у дакументе гаворыцца, што ЦРУ стаіць за арганізацыяй «каляровых рэвалюцый» у Грузіі, Украіне, на Тайвані і Блізкім Усходзе. Акрамя таго, Вашынгтон рабіў спробы выклікаць палітычныя ўзрушэнні ў такіх краінах, як Беларусь, Азербайджан, Іран, М'янма і Ліван. Адзначаецца, што ў 2020 годзе кітайская кампанія «360» выявіла раней невядомую арганізацыю, якая стаіць за кібератакамі. Яна выкарыстоўвала інструменты, звязаныя з ЦРУ, для правядзення хакерскіх нападзенняў на аб'екты ў КНР і іншых дзяржавах. Хакеры, якія атрымлівалі падтрымку ад ЦРУ, атакавалі важную інфармацыйную інфраструктуру, аб'екты аэракасмічнай і нафтахімічнай прамысловасці, навукова-даследчыя інстытуты, буйныя інтэрнэт-кампаніі і дзяржустановы.

ЕС плануе зрабіць вытворчасць узбраенняў адным з прыярытэтаў сваёй эканомікі

Еўракамісія мае намер зрабіць вытворчасць снарадаў і зброі адным з прыярытэтаў эканомікі ЕС разам з зялёнай энергетыкай. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на некалькі незалежных дыпкрыніц у Брусэлі. ЕК апублікавала план мілітарызацыі прамысловасці Еўрасаюза на агульную суму 1,5 млрд еўра: плануецца выдзеліць 500 млн еўра з бюджэту Еўрасаюза і прыцягнуць 1 млрд еўра з Еўрапейскага фонду міру. Адказным за мілітарызацыю прамысловасці ЕС прызначаны еўракамісар Цьеры Брэтон. Ён займаецца вывучэннем ваенна-прамысловага патэнцыялу краін ЕС, а таксама аналізуе патрэбнасці ваеннай індустрыі і неабходныя гарантыі для прадпрымальнікаў. Так, для ажыццяўлення маштабных ваенных інвестыцый бізнесмены павінны быць упэўненыя, што попыт на зброю будзе заставацца стабільным і не знізіцца пасля заканчэння канфлікту ва Украіне.

МВФ фіксуе паступовую адмову ад долара

Аб гэтым заявіла дырэктар-распарадчык Міжнароднага валютнага фонду Крысталіна Георгіева, паведаміла РІА «Навіны». Такую інфармацыю яна агучыла падчас дыскусіі, якая праходзіла на пляцоўцы аналітычнага Інстытута Мілкена ў Вашынгтоне. Давер да долара пачаў страчвацца ў сувязі з антырасійскімі санкцыямі, якія шмат у чым адбіліся на фінансавай і банкаўскай сферы. З-за гэтага некаторыя краіны пачалі шукаць варыянты адмовы ад міжнародных разлікаў у дадзенай валюце. Разам з тым Георгіева адзначыла, што глабальнай альтэрнатывы пакуль няма. У сусветным маштабе долар працягвае выкарыстоўвацца ў розных фінансавых аперацыях.

Фінансавая палітыка

Стаўка рэфінансавання зніжана да 10 % гадавых

А следам зніжаюцца і працэнты па крэдытах

Праўленнем Нацыянальнага банка было прынята рашэнне з 2 мая знізіць стаўку рэфінансавання з 10,5 % да 10 % гадавых, стаўку па крэдыце авернайт — з 11,5 % да 11 % гадавых, стаўку па дэпазіце авернайт — з 9,5 % да 9 % гадавых.

Упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка патлумачыла гэтае рашэнне тым, што працягваецца запаволенне інфляцыйных працэсаў. Як і чакалася, з-за эфекту высокай базы мінулага года ў сакавіку 2023 года гадавы прырост спажывецкіх цэн зменшыўся да 6 % супраць 11,7 % у папярэднім месяцы. Трэндавая інфляцыя знізілася да 6 % пасля 8,9 % месяцам раней. Пры ўмове адсутнасці шокаў чакаецца захаванне нізкіх штомесячных тэмпаў прыросту цэн на спажывецкім рынку, што ў найбліжэйшыя месяцы падтрымае трэнд на запаволенне гадавой інфляцыі.

Паступова аднаўляецца дзелавая актыўнасць у нашай краіне. На фоне таго што працягваецца зніжэнне працэнтных ставак, пашыраецца крэдытная падтрымка банкамі эканомікі ў нацыянальнай валюце. Сярэдняя стаўка па новых рублёвых крэдытах банкаў і ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» юрыдычным асобам у сакавіку паменшылася да 8,97 % гадавых.

Сяргей КУРКАЧ.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне міністру сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Шульгану Канстанціну Канстанцінавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Дзеля памяці

КАЛІ ПОДЗВІГІ, ТО ПРАЦОЎНЫЯ

Напярэдадні Дня Перамогі Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА прыняў удзел у цырымоніі ўскладання кветак да мемарыяльнага комплексу на Ваенных могілках сталіцы. Мерапрыемства адбылося ў рамках рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае. Памятаем кожнага».

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

У размове з журналістамі спікер ніжняй палаты парламента заўважыў, што ўскладанне кветак адбылося на святым месцы. «І ў Беларусі тысячы такіх месцаў, дзе здабылі вечную памяць абаронцы нашай Айчыны, — падкрэсліў ён. — Наш народ заплаціў страшную цану за незалежнасць і свабоду, за тое, каб самім вырашаць свой лёс і жыць на сваёй зямлі. Мы памятаем пра ўсіх гэтых людзей і аднаўляем імёны тых, хто загінуў у барацьбе за свабоду нашай краіны».

Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, на жаль, еўрапейскія дзяржавы адраджаюць ідэі нацызму, нахабна перапісваюць гісторыю, апаганьваюць і зносяць помнікі, адмаўляюцца ад свята Дзень Перамогі. «Гэта для нас непрымальна, — акцэнтаваў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Мы беражом памяць аб загінулых. Сёння наша галоўная задача — захаваць гэтую памяць, зрабіць усё для таго, каб наша краіна была суверэннай, мацаваць ваенную і эканамічную моц».

Адзін з галоўных кірункаў дзейнасці, па меркаванні спікера, — выхаванне падрастаючага пакалення, каб маладыя людзі раслі годнымі патрыётамі, абаронцамі нашай краіны. «Каб было больш працоўных подзвігаў і чыстае неба над Рэспублікай Беларусь», — адзначыў ён.

Вераніка КАНЮТА.

Смуткуем і ганарымся

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ў рамках акцыі «Беларусь памятае. Памятаем кожнага» ўсклаў кветкі да мемарыяла «Благаўшчына». На гэтым месцы ў гады акупацыі былі расстраляны дзясяткі тысяч людзей, у тым ліку вязні Мінскага гета і канцлагера «Трасцянец».

Як заўважыў кіраўнік урада, на прыкладзе нашых суседзяў відаць, што, як толькі мы пачынаем менш казаць пра подзвігі нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, як толькі радзей наведваем памятныя мясціны, менш расказваем дзецям пра гэтыя падзеі, тут жа пачынаюць з'яўляцца ўсялякага кшталту ачарняльнікі. «Яны льюць бруд на маршалаў Перамогі, ачарняюць подзвіг савецкага салдата, падвяргаюць сумневу ўсе дасягненні нашых народаў, — удакладніў Раман Галоўчанка. — Я ўпэўнены, што за некаторымі такімі «даследчыкамі» стаяць абсалютна зразумелыя сілы — так бы мовіць, прадстаўнікі пакуль мяккай сілы. Частка з іх пераследуе іншыя мэты, у прыватнасці нязграбныя спробы прылічыць здраднікаў і калабарантаў да змагароў за нацыянальнае вызваленне».

Па словах прэм'ер-міністра, усе гэтыя спробы нацэлены адарваць беларусаў ад мінулага. «Вядома ж, мы гэтага ніколі не дапусцім і будзем цвёрда і ўпэўнена працягваць тое, што рабілі заўсёды, — перакананы ён. — Мы ніколі не паддадзімся на тое, да чаго нас штурхаюць: адмовіцца ад мінулага, забыцца, прабачыць і смуткаваць. Так, мы смуткуем аб ахвярах, але галоўным чынам, хто павінен смуткаваць, — гэта тыя, хто падкідвае нам такі парадак дня. Мы смуткуем, але мы ж і ганарымся».

Фота БелТА.

Раман Галоўчанка выказаў упэўненасць, што на беларускай зямлі будуць з'яўляцца новыя мемарыялы. «Нехта скажа, што іх шмат, але шмат у параўнанні з чым? — задаецца пытаннем кіраўнік урада. — З больш як 10,6 тысячы спаленых вёсак? За час расследавання спраў аб генацыдзе беларускага народа іх стала амаль на 1400 больш, чым было ўстаноўлена раней». Раман Галоўчанка ўпэўнены, што колькасць знішчаных у гады Вялікай Айчыннай вайны вёсак будзе расці, і на месцы кожнай павінен быць пастаўлены помнік. «Тое, што не зробім мы, завершыць будучае пакаленне», — упэўнены ён.

Паводле БелТА.

Прыгажосць — і спакуса, і паратунак

Цыбулінкі і кветкавая геаметрыя

У цэнтральнай частцы парку на клумбах цяпер саліруе цюльпан. Спецыялісты кажуць — «стаіць на бакале». У бягучым сезоне высаджана каля 50 тысяч цыбулін больш як 20 сартоў. Самы ранні — цюльпаны Грэйга, позні — Дарвіна. Малюнак кожнага кветніка загадзя вызначаецца ландшафтным архітэктарам.

— Пры напаўненні клумбы прадумваецца вышыня кожнай кветкі, каб ні адна з іх не збіла агульны рытм малюнка. Падбіраюцца кветкі па форме бутона, колеры лісця зялёнай часткі. Бо нават іх адценні — ад светла-зялёных, салатавых ці з белымі палоскамі — могуць парушыць гармонію колеравага ўспрымання. Падбіраецца і сам «бакал» цюльпана — лілеякветны, махрысты, роўны... Вытрымліваюцца абавязкова неабходныя тэрміны красавання, каб клумба цвіла няспынна і змянялася арганічна, незаўважна для гледачоў, — расказвае пра раслінны свет парку **вядучы інжынер садова-паркавай гаспадаркі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Ганна РЭДЧЫЦ.**

Увогуле каманда, якая стварае тут раслінныя цуды — супрацоўнікі аддзела па добраўпарадкаванні і ўтрыманні тэрыторыі пры Гомельскім палацава-паркавым ансамблі. Іх клопат — азеляненне і догляд за зялёнымі насаджэннямі.

— Малюнак клумбаў у парку мяняецца два разы на год: пад вясновыя цыбульныя расліны і пасля пад адналетнікі. Пасля цвіцення цюльпанаў іх цыбулінкі прыбіраюцца. І толькі частка ідзе на захоўванне. Справа ў тым, што для афармлення кветнікаў выкарыстоўваюцца сартавыя цюльпаны, у якіх толькі першае цвіценне правільнае, дакладна заяўленае сортам па колеры і форме. Таму для цэнтральных клумбаў заўсёды заказваюцца новыя кветкі. Інакш немагчыма было б захаваць неабходныя вышыню сцябла расліны і спалучэнне колераў кветак. Цэнтральная частка парку вытрымана ў класічным рэгулярным ландшафтным стылі, які не церпіць густых разнамасных пасадак, — тлумачыць суразмоўніца.

Не менш педантычна і патрабавальна спецыялісты падыходзяць да афармлення клумбаў летняга сезона: каб яны не выглядалі блякла і былі заўважны здалёк, каб спалучаліся паміж сабой.

— Вялікая работа праводзіцца ў плане змены малюнка клумбаў. Абрысы будучых кветкавых ліній наносяцца проста па зямлі: замяраюцца вуглы, адлегласці рулеткай. Гэта цэлая матэматыка — усё разлічыць, — раскрывае дэталі Ганна Рэдчыц. — Пасля ўжо спецыяльна пад малюнак заказваюцца кветкі для клумбаў. У іх афармленні імкнёмся прытрымлівацца моды XVIII стагоддзя і гістарычнага стылю. Аддаём перавагу дывановым кветнікам. І гэта застаецца адметнай асаблівасцю нашага парку.

Жывая гісторыя

Сёлета на змену вясновым цыбульным на клумбах будзе высаджана каля 80 тысяч адзінак адналетнікаў. У гомельскім парку любяць працаваць з рознымі сартамі бягоній і аксамітак, каннаў, шалфею, ірэзінэ. Імкнуцца штогод пашыраць і калекцыю шматгадовых раслін. У фаварытах сярод мнагалетнікаў — хосты, гейхеры, магоніі, верас. А вось да стварэння жывых агароджаў і буйных элементаў азеляненне падыходзяць вельмі асцярожна. Пэўных правілаў у гэтым плане патрабуе і гістарычны стыль парку.

— У паўднёвай частцы парку, за лебядзінай сажалкай, ён вытрыманы ў пейзажным стылі, які дазваляе больш вольны падыход. Таму там, напрыклад, мы зрабілі лабірынт з елак. Дарэчы, захаваліся дакументы часоў князя Паскевіча, якія сведчаць, што на тэрыторыі парку некалі быў лабірынт. Але няма, на жаль, інфармацыі, у якой частцы парку ён размяшчаўся, з якіх раслін быў выкананы. Таксама захаваліся некалькі фотаздымкаў парку і запісы аб ім гаспадарчага плана — калі была дастаўка выпісаных раслін. Але не захавалася, на жаль, ні плана парку, ні вопісу расліннасці. Таму па крупінках, з розных гістарычных крыніц збіраем інфармацыю аб нашым парку, каб захоўваць яго гісторыю, — тлумачыць спецыяліст.

Падчас экскурсійнага маршруту не абыдзецца без гісторый аб самых пажылых тамтэйшых «насельніках». Старажылы — два дубы звычайныя, узрост якіх каля 220 гадоў. З часоў Паскевічаў захаваліся пасадкі ясеня, лістоўніцы, хвоі. А вось знакамітасць парку — гінкга білоба двухлопасцевы — даніна павагі заснавальнікам парку, уладальнікам гомельскага маёнтка — ужо з савецкіх часоў. Унікальныя рэліктавыя дрэвы — мужчынскае і жаночае — высадзілі ў 1960-я гады.

Батанічны парадак

Кожныя пяць гадоў, як таго патрабуе заканадаўства, у парку праводзіцца інвентарызацыя насаджэнняў. Спецыялісты-батанікі апісваюць стан, параметры, узрост раслін. Наладжаны і працэс замяшчэння дрэў, якія гінуць, але ідзе ён вельмі паслядоўна і абдумана.

— У савецкія часы пасадкі ў парку рабіліся хаатычна, без захавання нейкага плана. Гэта прывяло да таго, што вырасла і шмат самасейных дрэў, якія зацяняюць і перашкаджаюць іншым дрэвам, парк аказаўся загушчаны. Таму аднаўляльныя пасадкі робім з улікам асветленасці і неабходнага месца для будучага саджанца. І ў дадзеным працэсе мы не свавольнічаем. Абавязкова кансультуемся са спецыялістамі з Цэнтральнага батанічнага саду, Інстытута лесу, Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі, — адзначае Ганна Рэдчыц.

Цікава, што ёсць і пэўныя патрабаванні да «суіскальнікаў-навічкоў» для парку. Так, абнаўляюць пасадкі раслінамі, што добра прыжываюцца, якія непатрабавальныя ў доглядзе, упісваюцца ў агульную карціну і, што важна, не растыражаваныя на звычайных прысядзібных участках і гарадскіх вуліцах. Сёння з новых пасадак — магноліі, рададэндраны і самыя розныя сартавыя варыяцыі клёнаў.

Усе наведвальнікі парку не застаюцца раўнадушнымі да яго прыгажосці, з гонарам кажуць спецыялісты садова-паркавай гаспадаркі. Тым не менш, на жаль, да гэтага часу ёсць праблемы з паводзінамі некаторых гасцей.

— Многія не разумеюць, чаму нельга таптаць газон, ламаць кветку ці галінку дрэва, чаму не дазваляецца пайсці і сфатаграфавацца ў цэнтры клумбы. Каб было зручней фатаграфавацца, каля цэнтральнай клумбы ўстаноўлена лава ў стылі парку. Заўсёды тлумачым нашым наведвальнікам, што варта максімальна беражліва адносіцца да раслінага асяроддзя. Да таго ж наш парк не проста тэрыторыя для вольнага часу, а яшчэ і батанічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння. Гэта нясе і вялікую адказнасць, і вымагае пэўных правілаў работы з асяроддзем, знаходжання на яго тэрыторыі, — нагадала вядучы інжынер гаспадаркі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ВАЕННАЯ ПЕРАДАВАЯ ПАРТЫЗАНА МІХАІЛА ЦІТОВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Працавалі да вечара, а потым адправіліся пешшу дамоў. Для маладых ног пара кіламетраў — не адлегласць. Прыйшлі — і не пазналі сваёй вёскі. Каля сельсавета стаяць вялікія машыны, у іх сядзяць мужчыны, песні пяюць, гармонік іграе. Жанчыны галосяць: вайна...

Да прыходу ў пасёлак немцаў сям'я Міхаіла падрыхтавалася загадзя. Дзядзька Віліян, які ваяваў яшчэ ў Грамадзянскую вайну, прадбачліва заклікаў радню будаваць укрыццё ад снарадаў. Яны выкапалі непадалёк ад дома вялікую яму, зверху залажылі яе моцнымі дошкамі і засыпалі зямлёй. Калі пачаўся абстрэл, у гэты бліндаж пабеглі хавацца не толькі сваякі Міхаіла, але і аднавяскоўцы. Людзей набілася, як селядцоў у бочку. Цікаўны Міша, як толькі закончылася страляніна, пабег глядзець варонкі ад снарадаў. Выбег, а тут зноў абстрэл. Ён адразу ж успомніў словы свайго мудрага дзядзькі-франтавіка пра тое, што снарад у адну і тую ж варонку двойчы не трапляе. Толькі распластаўся ў ямцы, як пачуў, што над ім праляцеў снарад і разарваўся дзесьці на тэрыторыі іх сядзібы. Калі ўсё сціхла, хлопец вярнуўся назад.

— Баёў на тэрыторыі Дашкаўкі практычна не было, — расказвае суразмоўнік. — Калі прыйшлі немцы, яны з ліку мясцовых выбралі тых, хто будзе падтрымліваць у вёсцы нямецкі парадак. Гэтае так званае кіраўніцтва адразу ж данесла немцам, што ранняй восенню ў вёску вярнуліся з фронту зяці дзеда Парфірыя — Мітрафан і Сцяпан. Абодвух арыштавалі і павялі ў камендатуру. Дзед Парфірый, які да рэвалюцыі меў магчымасць навучыцца нямецкай мове, пабег вызваляць хлопцаў. Пераканаў немцаў, што яго зяці і блізка не камуністы, што яны беднякі і звычайныя працаўнікі. Іх адпусцілі. Але сярод аднавяскоўцаў знайшоўся чалавек, які далажыў акупантам, што і дзед, і яго зяці — не тыя, за каго сябе выдаюць. Яны, маўляў, заўзятыя камуністы, зяці наогул пісьменныя, працавалі кіраўнікамі. І немцы вярнуліся па іх зноў. Мітрафану хапіла розуму схавацца ў бульбоўніку, дзе ён праляжаў да таго моманту, пакуль немцы не з'ехалі з вёскі, а вось дзеда Парфірыя і Сцяпана забралі і расстралялі.

СЫНЫ ІДУЦЬ У БОЙ

Партызанам юны Міхаіл стаў у 1943 годзе, дзякуючы таму самаму Мітрафану, якому пашчасціла пазбегнуць расстрэлу. Мужчына быў звязаны з магілёўскім падполлем, узначальваў контрразведку Паўлоўскага партызанскага атрада. Немцы не віталі пераезды жыхароў на акупаваных імі тэрыторыях. Але Мітрафан меў сувязі з падпольшчыкамі, якія працавалі ў немцаў, і ў яго атрымалася ўзяць дазвол на выезд сям'і і малалетніх пляменнікаў з Дашкаўкі. У дарозе іх свайкі абоз, які рухаўся ў бок Магілёва, змяніў маршрут і накіраваўся ў партызанскую зону за станцыю Друць.

На заяву Мішы ўзяць яго ў партызаны ці то жартам, ці то сур'ёзна дзядзька сказаў: без зброі яны нікога не прымаюць. І падлетак вырашыў заслужыць гэтае права. Падгаварыў таварыша вярнуцца ў Дашкаўку і забраць прыхаваную ім у гаі зброю — вінтоўку і аўтамат, якія ён знайшоў на месцы баёў.

Але спецаперацыя не атрымалася. Як толькі хлопцы дабраліся да станцыі Друць, сутыкнуліся з конным раз'ездам на чале з дзядзькам Мітрафанам. Той пасля растлумачыў няўрымслівому пляменніку, што фронт ужо стаяў у Чавускім раёне на Проні і тое месца, дзе была яго схованка, кантралявалі немцы.

І ўсё ж такі ўпартага Міхаіла прынялі ў партызаны, ён стаў байцом 346-га партызанскага атрада, які дыслацыраваўся ў Бярэзінскім раёне. За пяць дзён хлопец засвоіў абавязкі мінёра (у арміі гэтаму вучыліся тры месяцы) і ў складзе дыверсійнай групы неаднаразова выходзіў на баявыя заданні. Юнак наогул быў здольны. Убачыў, як яго сусед па зямлянцы дзядзька Вася разбірае кулямёт, і запомніў у драбніцах. Потым у заклад разабраў кулямёт і сабраў з завязанымі вачыма. Дзядзька хацеў яго заблытаць, схаваў адну невялічкую дэталь, але хлопец, не намацаўшы яе, адразу ж спытаўся: дзе? Бывалыя партызаны ацанілі здольнасці юнага байца. Ён

З сямейнага альбома.

Мітрафан Паўлаў (сядзіць на крэсле), дзякуючы якому Міша трапіў у партызаны.

нават стаў героем партызанскай газеты, якую чыталі ўсе ў атрадзе ад першага да апошняга радка. За кемлівасць яго часта бралі на дыверсіі. За кароткі тэрмін ён паспеў паўдзельнічаць у дзевяці з іх: пяці на шашы, трох на чыгунцы і адной на прасёлкавай дарозе.

— Апошняя, дарэчы, была незапланаваная, — удакладняе былы партызан. — Мы ішлі закладваць выбуховыя прыстасаванні на некалькі чыгуначных ветак, але на месцы высветлілася, што немцы выкарыстоўваюць толькі адну. Тады я ўмацаваў міну, якую залажыў пад рэйкі. А для другой падшукаў месца на прасёлкавай дарозе. Немцы стаялі ў Лежнеўцы і ездзілі па гэтай дарозе раз па выбухам, ад разлітага з бензабаку паліва ўсчаўся вялікі пажар. У полымя па замерзлай каляі ўехала другая машына і таксама ўспыхнула. Нікому выратавацца не ўдалося. Загінуў не адзін дзясятак немцаў.

Кіраўніцтва партызанскага атрада лічыла Мішу Цітова адным з найлепшых байцоў, але склалася так, што ва ўзнагародных дакументах галоўныя яго подзвігі не былі пазначаны. У выніку хлопец атрымаў толькі медаль «Партызану Айчыннай вайны II ступені». А вось ордэны Чырвонай Зоркі і Славы III ступені, да якіх быў прадстаўлены, яму так і не ўручылі. Цікава, што на сайце «Партызаны Беларусі» яны пазначаны.

біць засады на партызанаў. Ранняй вясной тут яшчэ ляжаў снег. Днём, калі паветра прагравалася ледзь не да 20 градусаў, ён раставаў, а ноччу слупок тэрмометра апускаўся да мінус 10-15 градусаў, і снежная калатуша замярзала. Ад колаў машын на дарозе ўтварылася глыбокая каляя. Адно месца для міны было ідэальным. Гэтакае заглыбленне, прыкрытае сасновай галінай. Калі кола трапіць у яго, адразу не выедзе, падумаў я. Сюды і схаваў свой сюрпрыз для фашыстаў. Толу не пашкадаваў, паклаў некалькі кілаграмаў. Першую машыну з немцамі адразу ж разнесла выбухам, ад разлітага з бензабаку паліва ўсчаўся вялікі пажар. У полымя па замерзлай каляі ўехала другая машына і таксама ўспыхнула. Нікому выратавацца не ўдалося. Загінуў не адзін дзясятак немцаў.

БАІ ЗА КЁНІГСБЕРГ

Улетку сорак чацвёртага партызанскі атрад злучыўся з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі.

— Сустрэліся мы падчас бою на рацэ Дулебка каля вёскі Галынка, — расказвае ветэран. — Мы з левага боку вялі агонь па фрыцах, чырвонаармейцы — з правага. І вораг хутка здаўся. Партызанскі атрад расфарміравалі. Тых, хто нарадзіўся да 1926 года, адправілі адразу ж на фронт, а мяне і яшчэ двух таварышаў 1926 года нараджэння як асоб, дасягнуўшых прызыўнога ўзросту, паслалі на вучобу ў Казельск на тры месяцы — у запасную пятую стралковую дывізію. Сёмага лістапада мы ў складзе маршавай роты ўжо ехалі ў Прыбалтыку, дзе ўліліся ў склад 11-й гвардзейскай арміі.

За некалькі месяцаў апошняга ваеннага года навабранцы пешшу перасеклі Усходнюю Прусію. Дывізія, дзе ваяваў Міхаіл Цітоў, увесь час была на перадавой. Засталіся ў памяці моманты, калі прыходзілася наступаць па голым лузе: схавацца ад снарадаў не было дзе. Як перасякалі рэчку пад абстрэлам нямецкіх кулямётчыкаў. Былы франтавік расказвае, што ўвесь час яны амаль беглі, прыпыніцца было немагчыма, бо тады трапілі б пад ногі сваіх жа. Усё было так імкліва, што ён нават не запомніў, як пераадолеў водную перапону і выскачыў перад нямецкім акопам. Бачыў толькі, як вораг кінуў пазіцыю і бег хавацца ў лес.

Ваявалі ноччу. Немцы пад сховамі цемры адпачывалі і, калі на іх нападалі чырвонаармейцы, капітулявалі практычна без бою. Маладосць не ўспрымае смерць, нават калі тая падыходзіць зусім блізка. Але Міхаілу Цітову шчасціла. Куля не раз праходзіла ў міліметры ад яго — прабівала шынель, драпала скронь, аднойчы ледзь не прабіла чэрап — засталася толькі плеўка. Некалькі разоў быў кантужаны. У адным з баёў ад разрыву снарада ён на нейкі час страціў прытомнасць. Калі прыйшоў у сябе, ледзь выбраўся з-пад засыпаўшай яго зямлі. Правёў рукой па шчацэ і на пальцах убачыў кроў. Яна цякла з пашкоджаных вуха і носа. Двойчы баец трапляў у шпіталь — пасля ранення ў руку і пасля таго, як падарваўся на міне. Ён тады ваяваў у 202-м асобным палку 3-га Беларускага фронту. Полк атакаваў немцаў, якія выходзілі з акружэння. Асколкамі ад разрыву міны хлопцу цалкам раздрабіла пятку. У шпіталі яе потым ампутавалі. Некалькі гадоў пасля таго ветэран хадзіў на мыліцах. Калі вярнуўся дадому, яму сказалі: «Табе, хлопец, трэба вучыцца, бо для фізічнай працы ты работнік ніякі».

НІ ХВІЛІНЫ БЕЗ СПРАВЫ

Міхаіл Цітоў — чалавек упарты. Усміхаецца: яшчэ да вайны, калі хадзіў у школу, добрыя адзнакі атрымліваў, не разгортваючы падручнікаў. Дзякуючы фенаменальнай памяці ён амаль даслоўна запамінаў, што казаў настаўнік. Складанасці пачаліся, калі стаў вывучаць нямецкую і рускую мовы. Апошняя была для яго нязвыклая. Бацьку не падабалася, што сын прыносіць двойкі. Яны дамовіліся, што за пяцёрку Міша будзе атрымліваць 20 капеек, за чацвёрку — 15, за тройку — нічога, а вось за нездавальняючыя аднакі прыйдзецца грошы вяртаць. Хлопец узяўся за вучобу і ніжэй за чацвёрку дамоў аднак не прыносіў. За восень сабраў грошы на кляновыя лыжы, на якіх потым катаўся са стромкага берага ў Полацку.

Пасля вайны Міхаіл Цітоў з адзнакай скончыў Пінскі аграрны тэхналагічны тэхнікум, потым — Валагодскі малочны інстытут. Там жа знайшоў свой лёс — жонку Аляксандру, з якой нарадзілі дзвюх дачок і сына. Працаваў на малочным камбінаце ў Горках, Маладзечне, потым у Магілёве. Выручала не толькі добрая памяць, але і ўмелыя рукі. Ён з дзяцінства засвоіў урокі дзеда Парфірыя, які быў добры бондар. Прыходзілася рабіць і мэблю, і посуд. Яшчэ падчас вайны рабіў па просьбах аднавяскоўцаў вёдры, нават жлукту — аналаг сённяшняй пральнай машыны. Так называлася кадзь для мыцця бялізны. Ветэрану ўжо 96 гадоў, але ён самастойна вядзе гаспадарку на летніку ў Дашкаўцы, прыязджае сюды на ўсё лета з пыльнага Магілёва.

— Дагэтуль працую, — з гонарам кажа ён. — Паглядзіце, якую печку злажыў. У інстытуце я добра засвоіў прадмет, дзе расказвалі пра рэканструкцыю печак. Ганак абнавіў, дом абшыў, шпакоўню для птушак зрабіў. Без справы не сумую.



З сябрамі-студэнтамі (Міхаіл пасярэдзіне).

А яшчэ наш герой пасля вайны сур'ёзна займаўся фотасправай. Пакуль фатаграфавала, паспела пачуць ад яго некалькі карысных парад.

Пад канец ветэран пазяліўся ўласным рэцэптам бадзёрасці.

— Я заўсёды быў чалавек вясёлы, песні пеў, быў ініцыятыўны, — расказвае ён. — У тэхнікуме і інстытуце мяне выбіралі сакратаром камсамольскай арганізацыі. І па характары работы сваёй быў актыўны. Шэсць гадоў працаваў у абкаме партыі, быў галоўным інжынерам Магілёўскага гармалаказавода, потым аб'яднання, генеральным дырэктарам аб'яднання. На пенсіі некалькі гадоў выкладаў у Магілёўскім тэхналагічным інстытуце (цяпер Магілёўскі ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій. — **Аўт.**).

На развітанне франтавік цісне мне руку, і я адчуваю, наколькі яна ў яго моцная. Ён смяецца ў адказ: кажа, што пасля вайны, калі хадзіў на мыліцах, рукі ў яго сталі як жалезныя. А няўрымслівы характар дазволіў захаваць тую моц на гады.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара
і з архіва ветэрана.
Магілёўскі раён,
аграгарадок Дашкаўка.

Медыявымяральнік

ЯК МЫ ГЛЯДЗЕЛІ ТЭЛЕВІЗАР У КРАСАВІКУ

Хоць сёлета вясна і халодная, але цыбулю садзіць трэба. Таму, напэўна, у красавіку параўнальна з сакавіком знізіўся і рэйтынг тэлебачання, і сярэднясутачны час прагляду «блакітнага экрана» амаль на 10 працэнтаў. На 4,5 працэнта скараціўся сярэднясутачны ахоп аўдыторыі.

На чвэрць гадзіны пазней пасунуўся максімальны аб'ём аўдыторыі тэлебачання: з 17 да 22 гадзін. Павышэнне глядацкай актыўнасці ў выхадныя ў мінулым месяцы зафіксавана на гадзіну раней — з 8 раніцы. Гледзячы па зменах ва ўзроставай структуры гледачоў, на градкі першымі выйшлі людзі, якім больш за 65 гадоў, — іх колькасць перад тэлевізарам працягнула змяншацца. А вось «маладыя пенсіянеры», напэўна, вырашылі пачакаць, пакуль зямля лепш прагрэецца, — іх зноў было трошкі больш.

Нічога не змянілася ў топ-5 любімых жанраў сярод гледачоў: кіно, забаўляльныя праграмы, навіны, пазнавальныя праграмы, музыка. У красавіку незадаволеным застаўся попыт на кіно, навіны, сацыяльна-палітычныя і пазнавальныя праграмы. Прапанова спартыўных, забаўляльных, музычных і дзіцячых праграм перавысіла попыт.

Амаль усе каналы страцілі сярэднясутачныя рэйтынг і ў дынаміцы сярэднясутачнага ахопу. Дынаміка сярэднясутачнай долі трошкі вырасла толькі ў «РТР-Беларусь», «Беларусь 3» і Plus TV. На працягу другога вясновага месяца ў сярэднім 57,43 працэнта насельніцтва нашай краіны штодня ўключала тэлевізар (у сакавіку — 60,19 працэнта). Дынаміку сярэдняга часу прагляду сярод гледачоў здолелі падняць «РТР-Беларусь», Plus TV і «Беларусь 3».

У лідарах топ-15 праграм на каналах усё тыя ж назвы: «Прывітанне, Андрэй» (у суботу, 29-га), «Весткі тыдня» (нядзеля, 9-га), «Песні ад усёй душы» (нядзеля, 16-га) — усе «РТР-Беларусь». Наступныя тры пазіцыі — інфармацыйныя праграмы: «Вынікі тыдня з Ірадай Зейналавай» («НТБ-Беларусь», 2 красавіка), вячэрнія «Весткі» («РТР-Беларусь», 28 красавіка) і вячэрнія «Нашы навіны» (АНТ, 17 красавіка). На сёмым месцы выпуск ток-шоу АНТ 17 красавіка, прысвечаны спецыяльнай ваеннай аперацыі, якую ўзброеныя сілы Расіі праводзяць ва Украіне. У рэйтынг таксама трапілі эпізоды серыялаў «Вельмі дрэнная нявеста», «Запалярны вальс», «Каханне пераадолее ўсё» («РТР-Беларусь») і «Стражнік» («НТБ-Беларусь»).

Топавыя праграмы на каналах «РТР-Беларусь», «НТБ-Беларусь» і АНТ названы вышэй, а вось на «Беларусь 1» такой стаў выпуск «Зразумелай палітыкі» 17 красавіка, прысвечаны адносінам Венгрыі і Еўрасаюза; на МІРы — эпізод шоу-віктарыны «Гульня ў кіно» 5 красавіка; на СТБ, «Беларусь 2», «Беларусь 3» — эпізоды серыялаў «Падсудны» (28 красавіка), «Сляпая» (3 красавіка) і «Вечны кліч» (15 красавіка).

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 171

Сваю новую задачу даслаў наш чытач Вячаслаў Красічонак з Бабруйска *(гл. дыяграму)*.

Белыя: Кре2, Фа4, Лd1, Лf3, Сс3, Kd2, Kd4, пп. а5, е6, f2, h3 (11).

Чорныя: Кре5, Ch7, Kg6, пп. а6, d5, d6, е7, f4, f6, h4 (10).

Мат за 3 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Мінску прайшло першынство Беларусі сярод юнакоў да 20 гадоў. З дзесяці ўдзельнікаў чатыры мелі званні майстроў FIDE, прычым трое з іх занялі прызавыя месцы: 1) Максім Царук; 2) Арцём Стрыбук — па 7 балаў з 9; 3) Міхей Навуменка — 5,5.

Вось некалькі партый з гэтага спаборніцтва.

Аляксей Грыгаровіч — Максім Царук. 1. с4 f5 2. g3 Kf6 3. Cg2 e5 4. Kc3 Cb4 5. d3 C:c3+ 6. bc 0-0 7. Kf3 Kc6 8. 0-0 d6 9. Лb1 Лb8 10. Ke1 Cd7 11. Kc2 b6 12. Kb4 Ke7 13. Kd5 Ke:d5 14. cd Фе8 15. е4 Фg6 16. Фе2 Лf7 17. Cd2 Лbf8 18. f3 h5 19. Kph1 Cc8 20. f4 h4 21. fe de 22. gh fe 23. de Cg4 24. Фе3 K:e4 25. Л:f7 Kg3+ 26. hg Ф:b1+ 27. Kph2 Л:f7 28. d6 cd 29. Cd5 Фf1 30. C:f7+ Kp:f7 31. Фе1 Фh3+ 32. Kpg1 Cf3 33. Kpf2 Cd5 34. Kpe3 Kpe6 35. Cc1 Фg4 36. Kpd2 C:a2 37. Ca3 Фа4 38. Фс1 Cd5 39. Фb2 Cf3 40. Kpe3 Фе4+ 41. Kpf2 Cg4, 0:1.

Арцём Стрыбук — Яраслаў Навумовіч. 1. е4 с6 2. d4 d5 3. ed cd 4. Cd3 Kc6 5. c3 Kf6 6. Cf4 Cg4 7. Фb3 Фd7 8. Kd2 e6 9. Kgf3 Cd6 10. C:d6 Ф:d6 11. 0-0 0-0 12. Лfe1 C:f3 13. K:f3 Kd7 14. Ле3 Лab8 15. Фd1 b5 16. b4 e5 17. de Kd:e5 18. K:e5 K:e5 19. C:h7+ Kp:h7 20. Фh5+ Kpg8 21. Л:е5 Фс6 22. Фf3 Лbc8 23. Л:d5 Ф:c3 24. Ф:c3 Л:c3 25. Л:b5 Ла3 26. g3 Лd8 27. Kpg2 Лd2 28. Лb8+ Kph7 29. Лb7 f6 30. b5 Ла:а2 31. Л:а2 Л:а2 32. Kpf3 a5 33. Kpe3 a4 34. Kpd4 a3 35. Ла7 Лb2 36. Kpc5 a2 37. b6 Л:f2 38. b7 Лb2 39. Kpc6 Лс2+ 40. Kpd7 Лd2+ 41. Kpc7 Лс2+ 42. Kpb8 Л:h2 43. Kpa8 Лb2 44. b8Ф Л:b8+ 45. Kp:b8 Kpg6 46. Л:а2 Kpf5 47. Ла4 g5 48. Kpc7 Kpe5 49. g4, 1:0.

Платон Клачкоў — Міхей Навуменка. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kc3 d5 4. cd ed 5. Cg5 c6 6. e3 Cd6 7. Cd3 0-0 8. Фс2 h6 9. Ch4 Ce6 10. Kf3 Kbd7 11. 0-0 Фс7 12. Cg3 C:g3 13. hg Фd6 14. Лfc1 Лfe8 15. Ka4 Cg4 16. Kc5 K:c5 17. Ф:c5 Фе6 18. Ke5 Cf5 19. C:f5 Ф:f5 20. Фb4 Ke4 21. Лf1 Лab8 22. g4 Фе6 23. f3 c5 24. Фе1 cd 25. ed Фb6 26. Kd7 Ф:d4+ 27. Kph1 Kd2 28. Фf2 Фf4 29. K:b8 K:f1 30. Л:f1 Ф:b8 31. Лd1 Фе5 32. Ф:а7 Ф:b2 33. Л:d5 Фс1+ 34. Kph2 Фf4+ 35. Kpg1 Фg3, 0:1.

Пра такі ж турнір сярод дзяўчат — у наступным выпуску.

* * *

Фінішаваў XVI чэмпіянат Беларусі па завочных шахматах, які доўжыўся больш за два гады. Перамог Пётр Шчамялёў з Бялыніч, але, на жаль, яшчэ да афіцыйнага завяршэння спаборніцтва Пётр Пятровіч пайшоў з жыцця, яго ўзнагароды перададуць у музей. Віцэ-чэмпіёнам трэці раз у гісторыі такіх чэмпіянатаў стаў прадпрымальнік з Дзяржынска Анатоль Осіпаў, а 3-4 месцы падзялілі ўрач-псіхатэрапеўт Іван Сквіра (Гомель) і загадчык кафедры БНТУ Сяргей Рынкевіч (Мінск). Дарэчы, Іван Міхайлавіч і Сяргей Анатолевіч — дактары навук, адпаведна медыцынскіх і тэхнічных.

У турнірах па бліцы на сайце chess.com Дзяніс Лазавік заняў 9-я месцы з 568 і з 409, 13-е з 506, 17-е з 448.

* * *

Наш чытач, брэсцкі журналіст і гісторык шахматаў Віктар Жук выдаў у дзвюх частках поўны збор тысяч сваіх шахматных кампазіцый — пад назвай «Маё шахматнае поле».

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Cb2! Не вядзе да мэты 1. Фа5 (Лd3+)? Kpe6! Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

СЛОВА ДЛЯ ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ ПАКАЛЕННЯЎ

Напярэдадні прафесійных свят — Дня друку (5 мая) і Дня работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі (7 мая) адбылася творчая сустрэча на тэму «Дыялог пра сілу слова паміж прафесіяналамі ў журналістыцы і маладым пакаленнем». Спікеры, сярод якіх журналісты, рэдактары і таленавітыя прадстаўнікі маладога пакалення, што шукаюць сябе ў дадзеным напрамку, абмеркавалі актуальныя пытанні ў сферы СМІ, падзяліліся бачаннем таго, як сёння звяртаць увагу дзяцей і моладзі на галоўныя падзеі і быць цікавымі і запатрабаванымі ў сваёй аўдыторыі.

Найперш важна, каб у кожнай сферы людзі рабілі сваю справу прафесійна, з любоўю, самааддачай, не спыняючыся ў сваім развіцці і трымаючы руку на пульсе жыцця. Так, напрыклад, Марына Мароз, вядучая «Нашых навін», праграмы «Трывожная кнопка», рэдактар праграмы «Наша раніца» на тэлеканале АНТ, распавяла пра тое, што на шляху да вяршынь у прафесіі не бывае дробязяў.

— Яшчэ ў школе я пачынала шукаць сябе, удзельнічаць у розных творчых конкурсах. І гэта насамрэч дапамагае. Калі кажуць пра тое, што трэба брацца за ўсё, што датычыцца тваёй будучай прафесіі, гэта сапраўды так, бо вы пачынаеце з таго самага імгнення напрацоўваць свой уласны вопыт. І ён вам, паверце, дапаможа ў будучым, — распавядае Марына Мароз. — Потым я вучылася ў Брэсце на аддзяленні журналістыкі і ўжо падчас вучобы працавала на мясцовым тэлебачанні. Пісала сцэнарыі, сустракала гасцей, налівала каву. І такога ніколі не варта баяцца, таму што ніхто адразу не прыходзіць і не становіцца вядучым, журналістам альбо рэдактарам. Пачынаецца ўсё з малога. А ўжо па меры набыцця вопыту цябе заўважаюць, табе даюць нейкія шанцы, магчымасці, і так пачынаецца твой прафесійны шлях.

Колькі б ты ні працаваў у кадры, усё роўна перад выхадам у эфір заўсёды прысутнічае пэўнае хваляванне. І асабліва такі момант, які я раней не заўважала, што час нібы запавольваецца. Ты за апошнюю хвіліну паспяваш зрабіць усё: праверыць сувязь з рэжысёрскай групай, прагледзець тэкст і гэтак далей.

Яе калега з Беларускага радыё Наталля Сіротка не толькі згадала свой прыход у журналістыку, але і распавяла пра дзеючы і вядомы многім праект для дзяцей і падлеткаў «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» на канале «Культура». Яго стваральнікі даюць сваёй аўдыторыі не толькі цікавую і актуальную інфармацыю, але і пляцоўку для ўзаемадзеяння з дзіцячай і падлеткавай аўдыторыяй моладзі, крыху старэйшай за іх.

— У нас можна прагучаць на радыё. Наш праект для дзяцей і падлеткаў існуе ў нас ужо з 2008 года. Спачатку ён называўся «Мэры Попінс» і яго вялі тры журналісткі, абапіраючыся на ўласны вопыт выхавання дзяцей. А некалькі гадоў таму праграма змяніла сваю канцэпцыю і цяпер яна выходзіць пад назвай «Клуб дасціпных. Нястомных. Кемлівых». І мы абапіраемся на тое, што маладыя студэнты і спецыялісты распавядаюць пра нешта дзецям, школьнікам, падлеткам не з пазіцыі дарослых, а проста як старэйшыя таварышы, — дзеліцца кіраўнік праграмы Наталля Сіротка. — Радыё, як і тэлебачанне, — гэта не толькі журналістыка, а і мастацкае вяшчанне. Так, наш клуб выходзіць пяць разоў на тыдзень па буднях, і мы з калегамі рыхтуем рубрыкі для самых маленькіх, дзе прапаноўваем слухачам розныя гульні, загадкі, што датычацца тэмы беларускай культуры, распавядаем пра кніжкі для іх узросту. Таксама ў нас адбываецца чытанне мастацкіх кніг. Ёсць і рубрыкі для старэйшых дзяцей, у якіх расказваем пра здаровы спосаб жыцця, пра падзеі ў розных навучальных установах, а яшчэ ладзім размовы з дзецьмі ў прамым эфіры, дзе яны знаёмяць аўдыторыю са сваімі праектамі.

10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім (18+).
13.15 Маст. фільм «Тэрыторыя Каларада» (16+).
18.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым (16+).
19.10 Маст. фільм «Няма шляху» (16+).
23.00 «Блеф-клуб». 1998 год (16+).
0.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар (12+).
1.05 Маст. фільм «Жыла-была дзяўчынка» (16+).
2.45 Маст. фільм «Стары ваяка» (12+).

EuroSport 1

4.00 Тэніс. Турнір Вялікага шлема Australian Open. Жанчыны (6+).
6.00 Скалалажанне. Кубак свету. Мужчыны.
7.00, 11.00, 12.00, 22.00, 2.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія». Мужчыны (16+).
9.30, 1.30 Снукер (6+).
18.45, 0.30 Маунцінбайк. Кубак свету. Жанчыны.
19.40, 1.00 Маунцінбайк. Кубак свету. Мужчыны.
20.30 Усе віды спорту (6+).
21.00 Веласпорт. «Тур Венгрыі». Мужчыны (16+).

Кінакамедыя

1.05 «Вельмі дрэнныя матулі-2» (18+).
3.00, 3.50, 4.40 Серыял «Белы каўнерык» (12+).
5.30 «Малавіта» (16+).
7.30 «Як снег на галаву» (16+).
9.20 «Забойны футбол» (16+).
11.15 «Пагоня» (16+).
12.50 «Яйка Фабержэ» (12+).
14.30 «Доктар Дулітл» (12+).
16.00 «Доктар Дулітл-2» (12+).
17.35 «Сястрычка, дзейнічай» (12+).
19.30 «Сястрычка, дзейнічай-2» (12+).
21.25 «Дзядуля лёгкіх паводзін» (18+).
23.20 «Няўдачлівыя» (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.35 «Капітан Саўры-галава» (6+).
10.50 «Паглядзім» (12+).
11.20 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.00, 18.40, 2.05 «Сляпая» (16+).
14.30, 19.35, 2.50 «Варажбітка» (16+).
16.00 «Анатомія забойства» (16+).
17.45 «Знакі лёсу» (16+).
20.30 «Моцны арэшак» (16+).
22.45 «1408» (16+).
0.35 «Развітанне» (16+).
1.15 «Містычныя гісторыі» (16+).
3.40 «Відавочцы» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.15 Замбезія (6+).
6.35 Гісторыя аднаго вампіра (16+).
8.20 Канстанцін: уладар цемры (16+).
10.35 1+1 (16+).
12.35 Шакалад (12+).
14.45 Звычка жаніцца (16+).
16.50 Вады сланам! (16+)
19.00 Планета Ка-Пэкс (12+).
21.10 Чалавек дажджу (16+).
23.35 Абуджэнне (6+).
1.40 Буйная рыба (12+).
3.35 Сем жыццяў (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 ДынаСіці (6+).
5.20 Мы з Шэрлакам Холмсам (6+).
5.50 Пін-код (6+).
6.15 Бода Барода (6+).
6.40 Папялушка (16+).
8.10 Дзень выбараў (16+).
10.20 Дзень выбараў-2 (12+).
12.15 Гучная сувязь (16+).
13.45 Зваротная сувязь (16+).
15.25 Недарараваны (16+).
17.20 Праваднік (16+).
19.00 Зацьменне (12+).
20.25 Індыга (16+).
22.05 Мечаносец (18+).
23.55 Калідор неўміручасці (12+).
2.10 Ржэў (12+).
4.00 Радавы Чээрын (12+).

National Geographic

6.00 Асушыць акіян (16+).
6.45, 7.30, 22.30 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.15, 17.20, 3.45 Інжынерныя ідэі (16+).
9.05, 18.18 Самыя лепшыя суперкары (16+).
9.50, 10.35, 15.05, 18.50, 19.35 Дзікі тунец (16+).
11.15, 12.00, 14.20, 15.45, 16.35, 2.15, 3.00 Расследаванні авіякатастроф (16+).
12.50 Непакорны востраў (16+).
13.30, 0.45 Ліхтугі за мяжой (16+).
20.20, 21.05, 23.15, 0.00, 1.30 Аляска. Новае пакаленне (16+).
4.35 Навуковыя глупствы (16+).
5.20 Зона будаўніцтва (16+).

ЯСНАе

4.50 Серыял «Мы з будучыні» (12+).
6.20 Серыял «Участак лейтэнанта Качуры» (16+).
8.10 «Ясна аб міні-футболе».
8.40 Маст. фільм «Ржэў» (16+).
10.35 Серыял «Паляванне на піранню» (16+).
12.05 Серыял «Ланцуг» (16+).
13.40 Серыял «Снайпер-2. Тунгус» (16+).
15.10 Маст. фільм «Гарачая кропка» (16+).
16.25 Серыял «Вікінг-2» (16+).
18.00 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Слуцк» — «Іслач» (Мінскі раён).
20.10, 21.25 Серыял «Другія» (12+).
21.00 «Час высокіх тэхналогій».
22.15 Маст. фільм «План уцёкаў» (16+).
0.10 Маст. фільм «Забойца-2: супраць усіх» (18+).
2.10 Маст. фільм «Чужая вайна» (18+).
4.00 Серыял «1943» (12+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25 Зона Х (16+).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
9.55, 11.50, 12.15, 13.05 Меладрама «ЗАГС» (12+).
10.50, 1.10 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25 Серыял «Непрыгожая сяброўка. Чорны кот» (12+).
17.05 Адзін дзень (12+).
17.30 Маршрут пабудаваны (12+).
18.15 Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
18.40, 19.20 Меладрама «Разам назаўжды» (12+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
23.10 Серыял «След» (16+).
0.55 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05 «Сляпая» (16+).
10.35 «Знакі лёсу» (16+).
11.05 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).
12.35 «Дарагая, я забіў» (16+).
13.45 Прэм'ера. «Бітва сватоў» (16+).
14.55 Серыял «ІП Пірагова» (16+).
15.50 Мультсерыял «Прастаквашына» (6+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
17.00 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
17.35 Серыял «Спадарожнікі» (16+).
21.10 Спартлато 5 з 36, КЕНА.
21.20 Камедыя «Напарнік» (12+).
22.55 Біяграфічны фільм «Ідэальны палац Фердынанда Шэваля» (12+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 13.00, 16.30, 20.30, 23.55 «Навіны культуры».
8.15, 18.00 «Не хлебам адзіным». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.40, 21.05 «Вялікая вайна». Дак. драма (12+).
11.30, 16.40 «Паляванне на адзінарога». Маст. фільм (12+).
12.50 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
13.15, 21.55 «Дарагі мой чалавек». Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.00, 23.40 «Памяць змлі маёй».
15.15 «Сіла веры».
15.40 Вечары з Сімфанічным аркестрам.
20.40 «Калыханка» (0+).

Беларусь 5

7.00 Сняданак чэмпіёна.
7.30 Баскетбол. Чэмпіянат Беларусі.
9.15 Фактар сілы.
9.45, 15.20 Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «Мінчанка» — «Прыбужжа».
11.40 Піт-стоп.
12.00, 23.50 Бокс. Чэмпіянат свету.
15.00 Планета спорту.
17.20 Слэм-данк.
17.50 Пляжны футбол. ЦАР (Магілёў) — ПФК «Шчучын».
19.00 Хакей. Таварыскі матч. Расія (U-25) — Беларусь. У перапынку «Спорт-цэнтр».
21.20 Авертайм.
21.50 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. «Мальёрка» — «Кадыс». У перапынку «Спорт-цэнтр».

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Бесталковыя нататкі» (12+).
11.50, 13.15 Дак. серыял «Вялікая вайна» (16+).
14.05, 23.15 Фільм «Сардэчных спраў майстра» (12+).
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.30 «Трывожная кнопка» (16+).
18.20 «Народны ДАСТ» (12+).
19.00 «Поле цудаў» (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
21.15 «Лаўроў. За гранню» (16+).
21.20 Фільм «Жонка па сумяшчальніцтве» (16+).
1.05 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 Дак. праект. Без падману (16+).
10.40 «Карпаў». Серыял (16+).
12.15 Дак. праект. Знак якасці (16+).
13.45 «Драйв». Серыял (16+).
15.30 «Люты-2». Серыял (16+).
16.50 «Рашэнне ёсць!»
17.20 Дак. праект (16+).
18.45 «У пошуках ісціны. Этыкетка з падвохам».
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Міншчына».
20.40 «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
20.55 «Вышук». Серыял (16+).
23.10 Дак. праект. Дзевяностыя (16+).
0.30 «Зыходны код» (12+).

МІР

5.00 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).
6.25, 3.00 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
7.05 Маст. фільм «Кітайскі сервіз» [СЦ] (12+).
8.55, 10.10 Серыял «Непераможны» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 18.30 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.35 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50 Серыял «Сэрца трох» [СЦ] (12+).
23.55 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў» [СЦ] (12+).
1.30 Маст. фільм «Вясёлыя хлопцы» [СЦ] (0+).
4.40 Мультфільмы (6+).

РТР—Беларусь

6.00 «Новая раніца».
10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
10.05 Серыял «Пыльная работа» (16+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.50 «Кропкі над і» (16+).
14.40 «60 хвілін».
17.40 Серыял «Пошукі доказаў» (12+).
19.00 «Прамы эфір» (16+).
21.30, 23.15 Фільм «А досвіткі тут ціхія» (12+)

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10, 7.25, 8.20, 13.25, 16.45, 19.55, 22.45, 0.05 Сёння. Галоўнае.
6.15 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.05 Сфера інтарэсаў.
7.40 Будучыня сёння (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35 «НЗ.by».
8.55, 10.35 Фільм «Дзіна і Даберман» (16+).
11.20 Серыял «Зверабой» (16+).
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
14.00 Серыял «Геній» (16+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.00 «Чакай мяне» (12+).
20.10, 21.40, 22.50, 0.20 Дэтэктыў «Алекс Люты. Справа Шульца» (16+).
21.15 «НЗ.by: час вынікаў».
23.50 «Генацыд беларускага народа». Маст.-публіцыстычны фільм (18+).

8 канал

7.00, 14.55, 19.10, 21.05 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Камедыя «Сямейны канфлікт» (12+).
8.25 «Вакол свету».
9.20 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
10.10 Драма «Дараванне грахоў» (16+).
13.10 Серыял «Балада па Айчыннай» (16+).
15.00 «Класіка Уолта Дыснея» (0+).
15.45 Дэтэктыў «Пуаро Агаты Крысці» (12+).
16.40 Драма «Лёс» (16+).
19.15 Драма «Фаўда» (16+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.10 «Урокі Лазуркіна».
21.15 Драма «Вавілон» (18+).
0.20 Серыял «Амерыканцы» (16+).
1.55 Камедыя «Бывай, сябар» (12+).
3.35 Перапынак у вяшчанні.

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 12.30, 17.00, 19.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 14.20, 0.40 Прыступкі цывілізацыі. «Як рымляне змянілі Галію». Дак. серыял [СЦ].
8.30 «Жыццё і лёс» [СЦ].
8.50 «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
9.05 «Каралёк — птушка пеўчая». Тэлесерыял.
10.15 «Назіральнік».
11.15 XX стагоддзе. «Тэатральныя сустрэчы».
12.20 Колер часу.
12.45 Навіны. Падрабязна. Кіно.
13.00 «Паміж сваімі сувязь жывая...». Дак. фільм.
13.40 Штучны адбор.
15.15, 23.05 «Адлюстраваны час». Дак. серыял [СЦ].
15.45 «Белая студыя».
16.30 «Біблейскі сюжэт».
17.15, 1.35 Выбраныя творы.
18.40 «Андрэй і Зоя». Дак. фільм [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 «Абсалютны слых».
21.30 Улада факта.
22.15 «Каралёк — птушка пеўчая». Серыял.
23.35 XX стагоддзе. «Тэатральныя сустрэчы».

Настальгія

6.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Пінк Флойд» (18+).
6.55 «Пінк Флойд: канцэрт у Пампеі» (18+).
8.00, 9.40, 11.00, 14.10, 15.40, 17.30, 19.05, 21.40, 23.30, 2.00, 3.40 5.30 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
8.25, 11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.05 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар (12+).
13.05 Маст. фільм «Жыла-была дзяўчынка» (16+).
14.45 Маст. фільм «Стары ваяка» (12+).
18.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім (16+).
19.20 Маст. фільм «Незнаёмцы ў цягніку» (16+).
0.00 Маст. фільм «Тры мушкецёры» (16+).

EuroSport 1

4.00, 18.45 Тэніс. Турнір Вялікага шлема US Open. Жанчыны (6+).
6.00 Формула Е: чэмпіянат свету, Манака (6+).
7.00, 11.30, 13.30, 22.00, 2.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія». Мужчыны (16+).
9.30, 1.30 Снукер (6+).
11.15 Кузаўныя аўтагонкі: ESET V4 Cup. Хунгарорынг (6+).
20.00 Усе віды спорту (6+).
20.30 Парусны спорт (6+).
21.00 Веласпорт. «Тур Венгрыі». Мужчыны (16+).
0.30 Скалалажанне. Кубак свету. Мужчыны.

Кінакамедыя

1.20, 2.20 Серыял «Белы каўнерык» (12+).
3.05 «Два светы» (16+).
5.00 «Няўдачлівыя» (16+).
6.50 «Копы ў глыбокім запасе» (16+).
8.50 «Голы пісталет» (16+).
10.25 «Малавіта» (16+).
12.25 «Стоп-кран» (12+).
14.10 «Забойны футбол» (16+).
16.10 «Бацькі строгага рэжыму» (12+).
17.35 «Немаўля на прагулцы, або Паўзком ад гангстараў» (6+).
19.30 «Зялёная кніга» (16+).
21.50 «Як снег на галаву» (16+).
23.40 «Адпетыя ашуканцы» (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.05 «Старац» (16+).
10.05, 17.55 «Любоўная магія» (16+).
11.05 «Перыскоп» (16+).
11.25 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.05, 18.55, 3.05 «Сляпая» (16+).
14.35, 20.25, 3.55 «Варажбітка» (16+).
16.05 «У жніўні 44-га» (16+).
21.55 «Анатомія забойства» (16+).
23.40 «Грым» (16+).
0.30 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.25 «У ложку з ворагам» (16+).
4.25 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.00, 0.50 Рамэа і Джульета (12+).
7.50 Успаміны пра будучыню (16+).
10.15 Чатыры пяры (16+).
12.35 Піяніст (16+).
15.15 Рэальныя ўпыры (16+).
16.50 Канстанцін: уладар цемры (16+).
19.00 1+1 (16+).
21.00 Дастукацца да нябёсаў (16+).
22.35 Інструкцыі не прыкладаюцца (12+).
2.35 Джэйн Эйр (12+).
4.25 Оз: вяртанне ў Ізумрудны Горад (6+).

National Geographic

6.00 Фабрыка ежы (16+).
6.20, 22.30 Неверагодны доктар Пол (16+).
7.50, 17.40, 3.55 Інжынерныя ідэі (16+).
8.40, 18.25 Самыя лепшыя суперкары (16+).
9.25, 10.30, 15.00, 19.15, 20.15, 21.00, 21.45, 23.15, 0.00, 1.35 Дзікі тунец (16+).
11.10, 12.00, 16.05, 16.50, 2.20, 3.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
12.45 Непакорны востраў (16+).
13.30, 0.45 Ліхтугі за мяжой (16+).
14.15 Аўта-SOS (16+).
4.45 Зона будаўніцтва (16+).
5.10 Навуковыя глупствы (16+).

ЯСНАе

5.35 Серыял «Эшалон» (16+).
7.05 Серыял «Участак лейтэнанта Качуры» (16+).
8.50 «Раніца ЯСНАя».
9.55 Серыял «Снайпер. Зброя адплаты» (16+).
11.25 Маст. фільм «Механік» (16+).
13.00 Серыял «Чорны сабака» (12+).
14.30 Серыял «Штрафбат» (16+).
16.15 Серыял «Вікінг» (16+).
17.45 Серыял «Белая страла. Адплата» (16+).
19.25 Серыял «Другія» (12+).
21.00 Дак. цыкл «Сувязісты».
21.25 Маст. фільм «Багі Егіпта» (12+).
23.30 Маст. фільм «Загад» (0+).
1.45 Футбол. Расійская Прэм'ер-Ліга. «Хімкі» — «Дынама-Масква».
3.25 Серыял «1943» (12+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 11 мая ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.50 Зона Х (16+).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
9.55, 11.45, 12.15, 13.05 Серыял «Баранцава мора» (16+).
10.50 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25, 22.50 Серыял «След» (16+).
17.05 Беларуская часінка.
18.30, 19.20 Меладрама «Разам назаўжды» (12+).
21.00 Панарама.
21.45 Тэлефільм АТН (12+).
22.10 Беларуская супержанчына.
22.20 Адзін дзень (12+).
0.35 Сфера інтарэсаў.
01.10 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05, 18.30 «Сляпая» (16+).
10.35, 19.00 «Знакі лёсу» (16+).
11.05, 17.00 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).
12.35 Дэтэктыў «Снег і попел». Заключныя серыі (16+).
14.15, 19.25 Серыял «ІП Пірагова» (16+).
15.35 Мультсерыял «Прастаквашына» (6+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
20.45, 21.20 Ваенна-прыгодніцкі серыял «Спадарожнікі» (16+).
21.10 Спартлато 6 з 49, КЕНА.
22.45 «На нажах» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.25 «Беларуская кухня».
8.05, 13.00, 16.10, 20.30, 0.00 «Навіны культуры».
8.15, 18.50 «Зніклыя». Маст. фільм (16+).
9.55, 21.05 «Вялікая вайна». Дак. драма (12+).
10.45, 17.40 «Мама, я жывы». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.00 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
13.05, 21.55 «Аляксандр Маленькі». Маст. фільм (12+) [СЦ].
14.45 «Памяць зямлі маёй». Мемарыяльны комплекс «Буйніцкае поле».
15.00 «Напярэдадні пераможнай вясны».
15.55 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
16.20 «Жывая спадчына».
16.45 «Кадры жыцця».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.35 «Партызанскі рубеж». Фільм адзінаццаты і дванаццаты, заключны.

Беларусь 5

7.00 Футбол. Кубак Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Славія» (Мазыр).
8.45 Між іншым.
9.05 Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Будаўнік» (Мінск).
11.00 Слэм-данк.
11.30 Футбол. Кубак Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Нёман» (Гродна).
13.25 Бокс. Чэмпіянат свету.
16.30 Фактар сілы.
17.00 Піт-стоп.
17.20 Баскетбол. Чэмпіянат Беларусі. У перапынку «Спорт-цэнтр».
19.20 Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «Мінчанка» — «Прыбужжа».
21.20 Спорт-цэнтр.
21.30 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі.
23.25 Баскетбол. Адзіная ліга.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
7.10, 8.15 «Трывожная кнопка» (16+).
«Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Бесталковыя нататкі» (12+).
11.50, 13.15 Дак. серыял «Вялікая вайна» (16+).
14.05, 23.10 Фільм «Афіцэрскія жонкі» (16+).
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
19.05 «Лялькі спадчынніка Тутці» (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
22.00 Фільм «Скачок Багамола» (16+).
1.05 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 Дак. праект. Без падману (16+).
10.40 «Карпаў». Серыял (16+).
11.30 Дак. праект. Знак якасці (16+).
13.55 «Выкідала». Серыял (16+).
14.45 «Драйв». Серыял (16+).
16.50 «Люты-2». Серыял (16+).
20.15, 23.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
20.40 «Беларуская супержанчына».
20.50 «Вышук». Серыял (16+).
23.10 Дак. праект. Дзевяностыя (16+).
0.30 «Дзіця Асірыса» (16+).

МІР

5.00 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» [СЦ] (12+).
6.00, 1.15, 3.45 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
6.40, 10.10 Серыял «Сямнаццаць імгненняў вясны» [СЦ] (12+).
10.00, 13.00, 16.00, 18.30 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.15, 1.40 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 2.20 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.35 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50 «Гульня ў кіно» (12+).
21.30 Серыял «Непераможны» (16+).
4.35 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» [СЦ] (12+).

РТР—Беларусь

6.00 «Новая раніца».
10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
10.05 Серыял «Пыльная работа» (16+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Так! Але».
12.20 «Пра самае галоўнае» (12+).
13.00 «Кропкі над і» (16+).
14.40 «60 хвілін».
17.40 Серыял «Пошукі доказаў» (12+).
19.00 «Малахай» (16+).
21.30 Фільм «Дзяржаўная мяжа. Год сорак першы» (12+).
23.15 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10, 7.25, 8.20, 13.25, 16.45, 19.45, 22.35, 23.55 Сёння. Галоўнае.
6.15 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.05 Сфера інтарэсаў.
7.40 Будучыня сёння (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.15 «НЗ.by».
8.55, 10.35 Фільм «Дзіна і Даберман» (16+).
11.20 Серыял «Зверабой» (16+).
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
14.00 Серыял «Геній» (16+).
16.55 «За гранню» (16+).
17.55 «ДНК» (16+).
20.10, 21.35, 22.40, 0.20 Дэтэктыў «Алекс Люты. Справа Шульца» (16+).
23.40 «Генацыд беларускага народа». Маст.-публіцыстычны фільм (18+).

8 канал

7.00, 14.15, 19.15, 21.05, 0.35 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Камедыя «Сямейны канфлікт» (12+).
8.25 «Вакол свету».
9.10 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
10.45 «Любімае кіно».
12.30 Серыял «Балада па Айчыннай» (16+).
14.20 «101 далмацінец» (0+).
15.40 Дэтэктыў «Пуаро Агаты Крысці» (12+).
16.30 Драма «Лёс» (16+).
19.20 Драма «Фаўда» (16+).
20.45 «Вечарніца» (0+).
20.50 «Асалам алейкум, Беларусь!»
21.00 «Урокі Лазуркіна».
21.10 Трылер «Перавал» (16+).
0.40 Серыял «Амерыканцы» (16+).
2.15 Драма «Спакуса» (18+).
4.10 Перапынак у вяшчанні.

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 12.30, 17.00, 19.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 14.20, 0.45 Прыступкі цывілізацыі. Дак. серыял [СЦ].
8.30 «Жыццё і лёс»
8.50 «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
9.05, 22.15 «Каралёк — птушка неўчая». Серыял.
10.15 «Назіральнік».
11.15, 23.35 XX стагоддзе.
12.45 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
13.00 Астравы.
13.40 «Абсалютны слых».
15.15 «Адлюстраваны час». Дак. серыял [СЦ].
15.45 «Тэорыя адноснасці шчасця. Паводле Андрэя Будкера». Дак. фільм.
16.30 Маё каханне — Расія! [СЦ]
17.15, 1.40 Г. Малер. Сімфонія № 5.
18.30 Колер часу.
18.40 «Андрэй і Зоя». Дак. фільм [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 «Джэнтльмены ўдачы». Я злы і страшны шэры воўк». Дак. фільм.
21.30 «Энігма. Ванэса Веласка».
23.05 «Адлюстраваны час». Дак. серыял [СЦ].

Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар (12+).
7.00 Маст. фільм «Жыла-была дзяўчынка» (16+).
8.05, 9.40, 11.30, 13.05, 15.40, 17.30, 18.55, 20.50, 21.40, 23.30, 2.00, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
8.45 Маст. фільм «Стары ваяка» (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 2.25 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім (16+).
13.20 Маст. фільм «Незнаёмцы ў цягніку» (16+).
18.00 «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім (18+).
19.15 Маст. фільм «Тэрыторыя Каларада» (16+).
0.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Пінк Флойд» (18+).
0.55 «Пінк Флойд: канцэрт у Пампеі» (18+).

EuroSport 1

4.00, 19.45 Тэніс. Турнір Вялікага шлема US Open. Мужчыны (6+).
6.30 Усе віды спорту (6+).
7.00, 11.30, 13.45, 22.00, 2.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія». Мужчыны (16+).
9.30, 1.30 Снукер (6+).
11.00 Парусны спорт (6+).
18.45, 19.15 Маунцінбайк. Кубак свету (6+).
21.00 Веласпорт. «Тур Венгрыі». Мужчыны (16+).
0.30 Скалалажанне. Кубак свету. Мужчыны.

Кінакамедыя

1.45, 2.50, 3.40, 4.30 Серыял «Белы каўнерык» (12+).
5.20 «Непаслушнік» (12+).
7.30 «Голы пісталет 2 1/2: пах страху» (12+).
9.05 «Голы пісталет 33 1/3: апошні выпад» (16+).
10.35 «Яйка Фабержэ» (12+).
12.10 «Бацькі строгага рэжыму» (12+).
13.40 «Немаўля на прагулцы, або Паўзком ад гангстараў» (6+).
15.30 «Зялёная кніга» (16+).
17.55 «Доктар Дулітл» (12+).
19.30 «Доктар Дулітл-2» (12+).
21.00 «Гульня ў чатыры рукі» (16+).
23.10 «Вельмі дрэнныя матулі» (18+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.15 «Старац» (16+).
10.10, 17.55 «Любоўная магія» (16+).
11.05 «Паглядзім» (12+).
11.35 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 18.55, 3.30 «Сляпая» (16+).
14.40, 20.25, 4.00 «Варажбітка» (16+).
16.10, 21.55 «Анатомія забойства» (16+).
23.40 «Грым» (16+).
0.30 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.25 «Двухсотгадовы чалавек» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.50 Розум і пачуцці (12+).
8.10 Дастукацца да нябёсаў (16+).
9.50 Інструкцыі не прыкладаюцца (12+).
12.00 Чалавек-Павук (12+).
14.10 Чалавек-Павук-2 (12+).
16.30 Чалавек-Павук-3 (12+).
19.00 Звычка жаніцца (16+).
21.05 Вады сланам! (16+)
23.10 Шакалад (12+).
1.20 Чатыры пяры (16+).
3.20 Успаміны пра будучыню (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 ДынаСіці (6+).
6.20 Пін-код (6+).
7.00 Бода Барода (6+).
7.55 Пальма (6+).
9.55 Экіпаж (6+).
12.15 Чарнобыль (12+).
14.40 Рубеж (12+).
16.20 Стомленыя сонцам (16+).
19.00 Стомленыя сонцам-2 (16+).
22.15 Стомленыя сонцам-2: цытадэль (16+).
1.10 Край (16+).
3.05 Недараваны (16+).
4.50 Залатая антылопа (16+).

National Geographic

6.00 Асушыць акіян (16+).
6.50, 22.35 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.15, 17.15, 3.55 Інжынерныя ідэі (16+).
9.05, 18.05 Самыя лепшыя суперкары (16+).
9.45, 10.30, 14.15, 15.00, 18.50, 19.35 Дзікі тунец (16+).
11.15, 12.00, 15.45, 16.30, 20.15, 21.00, 23.20, 0.05, 1.40, 2.25, 3.10 Расследаванні авіякатастроф (16+).
12.45 Непакорны вострай (16+).
13.30, 0.50 Ліхтугі за мяжой (16+).
21.45 Злавіць кантрабандыста: аэрапорт Кенэдзі (16+).
4.45 Навуковыя глупствы (16+).
5.35 Зона будаўніцтва (16+).

ЯснАе

4.55 Серыял «Мы з будучыні» (12+).
6.30 Серыял «Участак лейтэнанта Качуры» (16+).
8.15 «Ясна аб футболе».
8.45 Серыял «Снайпер. Зброя адплаты» (16+).
10.20 Маст. фільм «Полымя» (12+).
12.55 Серыял «Чорны сабака» (12+).
14.30 Серыял «Штрафбат» (16+).
16.10 Серыял «Вікінг» (16+).
17.45 Серыял «Белая страла. Адплата» (16+).
19.25 Серыял «Другія» (12+).
21.00 «У адкрытым доступе».
21.30 «PROфутбол».
21.50 Маст. фільм «Кікбоксер» (16+).
23.30 Маст. фільм «Рух уверх» (12+).
1.45 Маст. фільм «Прывідны гоншчык-2» (12+).
3.20 Серыял «1943» (12+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

ПРЫГАЖОСЦЬ І КАПУСТА

Гадоў з трыццаць таму на нашым заводзе выдзялялі ўчасткі пад будаўніцтва дач. Бралі іх вельмі многія, нават я, помню, запісалася! Але ж потым з'ездзіла на месца, паглядзела і ўспомніла прадбачлівага Адольфа Быкоўскага, яго песню, што з гэтага кахання, «пэўна, ніц не бэндзе». Ну па-першае, да таго ўзлеску, які аддалі нашаму таварыству, з паўгадзіны язды, з паўгадзіны хадзьбы, па-другое — спачатку трэба высякаць кустоўе ды выкарчоўваць пні, чакаць, пакуль зробяць дарогу, і толькі пасля таго думаць пра будаўніцтва.

Добра тым жанчынам, у якіх вялікія сем'і, рукастыя мужы ды якія-ніякія грошы. Маіх запасаў магло хапіць хіба на цэглу для прыбіральні ды нейкі хлевушок...

Карацей, я збаялася і здала назад. Галя, мая прыяцелька (таксама адзіноката) прыяцелька, аказалася куды смялейшай. Можа, таму, што ў яе сястра, у сястры — муж, а галоўнае — малая дачушка, якую цётка любіла як родную і вельмі ж хацела вывозіць на свежае паветра, на свае клубніцы ды вішанькі...

А таму — што рабіць — як той казаў, увязалася ў «бойку» і... перамагла: на пяці «сотках» зямлі пасадзіла садок, разбіла градкі з клубніцамі, морквай, цыбуляй, буракамі-гарбузамі, хоць праз пяць гадоў, але паставіла дамок з верандай і невялічкую цяпліцу для перцаў-агуркоў...

Усё гэта — нават потым, у паважаным узросце, яна садзіла і даглядала пераважна адна, не без таго — зрэдку часталася. І таму, калі нейкай вясной Галя папрасіла мяне пад'ехаць, дапамагчы з пасадкамі, я лёгка згадзілася.

...Ужо на месцы ўбачыла, што прыйдзецца цяжка, бо толькі пад капусту адведзены гоні — ледзь не палова гарода! «Навошта столькі?» — спытала ў гаспадыні.

Замест адказу дачніца падала мне выразку з нейкай старой газеты (знаёмы іх на распальванне прывёз), дзе паведамлялася, што група англійскіх вучоных на працягу, здаецца, пяці гадоў вывучала ўплыў белакачаннай капусты на... рост дзявочых грудзей (?!), што ў даследаваннях бралі ўдзел тысячы дзяўчынак, якіх падзялілі на групы. У першай, калі памяць не падводзіць, дзяўчаткі спажывалі качаны да кілограма, у другой — ад двух да чатырох, у трэцяй — ад чатырох да шасці, у чацвёртай...

У выніку была заўважана прамая залежнасць аб'ёму грудзей ад вагі качаной.

— Ды лухта ж тут нейкая! Ты, што, у гэта верыш? — чытаючы заметку, пыталася я ў дачніцы.

— А раптам праўда? — усур'ёз спадзявалася яна, маючы намер пасадзіць і вырасціць дзясяткі менавіта вялікіх (!) качаноў для сваёй любімай пляменніцы.

...Пахіснуць спадзяванні прыяцелькі на чароўную сілу капусты не ўдавалася ну ніяк! Нават пасля таго як уголас і двойчы мы прачыталі прыпіску, што тым англійскім вучоным могуць прысудзіць Шнобелеўскую прэмію.

На шчасце, на зваротным баку газетнай выразкі адшукалася дата публікацыі — 1 (!) красавіка...

Толькі пасля таго Галя пайшла па суседках, каб раздаць ім большую частку сваёй шыкоўнай расады і, напэўна ж, нікому пры гэтым не сказаць, што многае (а тым больш цяпер) трэба чытаць удумліва, звяртаючы ўвагу на прыпіскі і — абавязкова! — на дату публікацыі.

А. Цімафейчык,

г. Віцебск.

ЯК Я БЫЎ ФІЛУМЕНІСТАМ

Дзеці — яны, згадзіцеся, усе збіральнікі — то лісцікаў, то каменьчыкаў, то машынак і лялек, потым — марак, паштовак, значкоў, манет...

Мястэчка, дзе я нарадзіўся, было, і засталося досыць вялікім, мо таму, што праз яго з поўначы на поўдзень пралягае аўтамагістраль, абапал якой (як калісьці на рэках) заўжды сяліліся людзі, віравала жыццё. І чаго ў ім толькі не было: кірмашы, цыгане, жабракі, вайскоўцы (за царскім часам на пастой прасіліся ўланы з драгунамі, у святы — палкавы аркестр іграў, за саветамі — гарнізон непадалёк знаходзіўся... Па вуліцах ездзілі анучнікі — на фурманках, з вялізнымі куфрамі... Шчасце было зазірнуць туды, а ўжо разам з сябрамі пракрасціся на гарышча закінутай хаты, нешта знайсці... Ну вось такое — чаго ў іншых няма...

Людзі і сапраўды прыязджалі да нас і ад нас ад'язджалі — на цаліну, на поўнач, на шахты. Прысылалі адтуль лісты, паштоўкі, пасылкі.

Нас, малых, цікавілі найперш канверты і маркі. Займеўшы тыя, мы раскладвалі іх па тэмах (гарады, людзі, кветкі, жывёлы, самалёты), мяняліся, аж пакуль не з'явілася новае захапленне: карцінкі на пушках запалак. Прычым — не з барысаўскіх ды пінскіх фабрык (хоць нешта цікавае траплялася і там), а з замежных.

Справа ў тым, што каля нашай прыдарожнай крамы часцяком прыгаможвалі розныя фуры. Нехта першы адважыўся падысці, папрасіць, а потым ужо — быццам тыя туземцы з богам забытых мясцін — мы зляталіся да іншаземных кіроўцаў, акружалі іх, наперабой прасілі памяняць пачак на пачак: наш, поўны, на няхай сабе пусты, але ж іншы, «імпартовы»...

Бацькі сталі хаваць ад нас запалкі, мы ж, дзеці, усё роўна іх знаходзілі і мянялі!

...Валодзя быў маім аднакласнікам і таксама выдатнікам. Не сказаць, што мы з ім сябравалі, але ж зрэдку я заходзіў да яго дадому (ён жыў непадалёк ад школы, затое я — бліжэй да магістралі!)...

Ён таксама быў філуменістам (гэта я цяпер паразумнеў: у інтэрнэце паглядзеў, як называюцца тыя, хто збірае запалачныя этыкеткі) і хваліўся, што ўсіх нас, нават разам узятых, ён, маўляў, хутка пераплюне: яму дзядзька дапаможа, які жыве ў самой Маскве.

Што той дзядзька можа зрабіць, нам уяўлялася дрэнна: ну не пойдзе ж ён недзе на трасу мяняць пушкі... Значыць, хлусіць Валодзя?!

Аж не: праз месяц-другі ён сапраўды з форсам запрасіў мяне да сябе, каб даказаць, што слова трымае, што перамог, бо той самы дзядзька па пошце прыслаў яму цэлую скрынку, даверху набітую ўпакоўкамі этыкетак, прычым новымі, на асобныя тэмы. Не іначай недзе купіў? Ці дастаў — на запалкавай фабрыцы.

Ну і хіба ж гэта калекцыя?! Такую — нават глядзець нецікава!

Карацей, філуменістамі мы з сябрамі пабылі нядоўга — на радасць мамам, якія перасталі хаваць ад нас запалкі і, магчыма, на шчырае засмучэнне кіроўцам замежных фур, якім, напэўна ж, цікава было пагаманіць, паглядзець на тутэйшых дзяцей і не лішні раз успомніць сваіх.

Іван Гаральчук,

г. Мінск.

ХТО Ў ДОМ, ХТО З ДОМУ...

Мая прыяцелька Таццяна (а цяпер яшчэ і Пятроўна) у дзяцінстве марыла пра чырвоны паветраны шарык. У найбліжэйшых крамах такія не прадаваліся, але іх можна было выменяць — у анучнікаў, што зрэдку праязджалі па вуліцах горада ды збіралі розную старызну...

Старым у Танінай мамы (яна варажыла: перашыць ці яшчэ панасіць?) было зімовае паліто.

Якраз яго — з вялікім лісіным каўняром — дачушка і аддала анучніку ўзамен на чырвоны паветраны шарык.

Прадпрымальная была дзяўчынка! А ў 17 гадоў — якая адважная...

Далей — з яе слоў:

«Раней, за савецкім часам, прэстыжна было працаваць не столькі там, дзе добра плацілі, колькі там, дзе была магчымасць нешта купіць, па блаце дастаць альбо нават украсці.

Зрэшты, гэта — вельмі жорсткае слова, тады казалі мякчэйшае, больш далікатнае — «вынесці». У людзей нават «званне» было — «несуны». Што-нішто, пакрысе, па драбязе яны (і, відаць, не з добрага жыцця) выносілі з мясакамбінатаў, сталовых, рэстаранаў, з хлеба- і малаказаводаў...

Наша хата стаяла побач з лікёра-гарэлачным, і дзверы ў ёй, а тым больш веснічкі-вароты, ніколі не замыкаліся. Моды такой не было: гаспадары, сыходзячы з дому, пакідалі на ганку венікі альбо калкі ў прабоях, гэта азначала, што дома нікога няма...

Якраз у такія гадзіны да нас на двор і сталі завітваць заводскія «несуны»: забягуць (як правіла, у абед) схаваюць бутэлькі з гарэлкай ці спіртам (вадкай валютай іх не звалі яшчэ — слова такога не ведалі), потым, пасля работы, гэтак жа ціха заскочаць і забяруць... Праўда, калі паспеюць, бо мама часам апярэджвала: то ў застрэшку, то недзе пад ганкам знаходзіла «падарункі». У гаспадарцы — ды без мужчын-гаспадароў — без іх ну ніяк!

Зрэшты, у маміны клопаты я тады не дужа ўнікала: старалася добра вучыцца ў школе, потым у інстытуце...

А тут неяк раз прыхварэла: у будны дзень на заняткі не пайшла. Сяджу сабе дома, канспекты чытаю. Чую, нехта бразнуў дзвярыма, а ў хату не ідзе. Ну, думаю, не іначай «нясун» — ужо ў сенцах гарэлку хавае! Не хапала, каб заўтра ў хату прынёс?!

Разазлавалася, выбягаю насустрач, крычу: «Ну колькі можна тут швэндацца?!» — разварочваю «госця» тварам да дзвярэй і ў плечы.

Той — знячэўку — нават пікнуць не паспеў: выскачыў на ганак...

А я ж хоць маладая, але гаспадыня — як быццам. Бачу, што на крэсле нешта засталося... У паперы... Ну, чужое ж?! Хапаю ў руку — бутэлька, выбягаю на двор, крычу: «Стой, зладзюга! Забірай сваю гарэлку, і каб мы цябе тут не бачылі!»

Даганяю «госця», суну бутэльку ў кішэнь і гордая — без фігі не да носа! — вяртаюся ў хату, за стол, да сваіх канспектаў...

У хуткім часе — мама на парог.

Я, вядома ж, насустрач: давай расказваць ёй пра сваю прынцыповасць і смеласць. Ну як жа: «адбрыла», прагнала «несуна» разам з яго дабром!

Мама паслухала мяне і толькі ўздыхнула: «Божа ж, мой божа! Усе людзі як людзі: цягнуць у дом, а табе б — толькі з дому... Я ж гэту бутэльку Валодзю купіла! Ён абяцаў нам бульбу пасадзіць... Ну не магу ж я добрага чалавека спіртам-сырцом аддзякаваць! Па «Маскоўскую» ў краму схадзіла, пад рукамі ў сенцах пакінула. А ты — нейкаму прайдзісвету аддала, як тое паліто з лісой — за паветраны шарык... Дык зараз жа бяжы ў краму, са сваёй стыпендыі купляй бутэльку «Маскоўскай». Можа, паразумнееш крыху. А не — дык прападзеш са сваім характарам!»

— За сем дзесяцігоддзяў ён у мяне, здаецца, не змяніўся, — завяршаючы аповед, прызналася Пятроўна. — Ніколі і нічога я не выгадавала, не хітрыла і, дзякуй богу, жыву, усё, што трэба, маю.

Л. Васільева,

г. Магілёў.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

Не для падручніка гісторыі

Чаму нам дагэтуль баліць вайна

АПОШНІЯ некалькі дзён я пішу адзін дзённік. Не свой асабісты — у ім словы людзей, якіх ужо няма на гэтым свеце. Не для сябе, не для «наступных пакаленняў». Я пішу яго для сваёй стрыечнай сястры. Яна жыве ва Украіне, у Палтаўскай вобласці. Ёй пяцьдзясят два гады, яна выкладае матэматыку ў каледжы. Мы з ёй унучкі ветэрана вайны. Наш дзед, пайшоўшы з беларускай вёсачкі ў армію ў 1939-м, трапіў у Баку, у артылерыйскае вучылішча. Адтуль, у статусе малодшага камандзіра — у самае пекла вайны. Прайшоў са сваім артылерыйскім разлікам ад Сталінграда да Прагі. Пасля яшчэ давялося паваяваць у Манчжурыі... Памёр рана, у 1960-х, таму пагаварыць з ім, распытаць не давялося. Але мы з сястрой заўсёды ўспаміналі яго з гонарам і ўдзячнасцю — і з Днём Перамогі адна адну віншавалі гэтаксама абавязкова, як і з Новым годам, і з днём нараджэння.

Усё памянялася... не, не з пачаткам СВА — нашмат раней. У маі 2014-га, калі на маё віншаванне яна адказала штосьці накшталт «для каго свята, для каго — не». За таго часу мы шмат спрачаліся, пакуль я не пакінула гэту безвыніковую справу: у чалавека (даруслага матэматыка — чаго ж тады чакаць ад іншых?) настолькі забітыя мазгі наратывамі майдана, «Квартала-95», «Слугі народа»..., што дастукацца да рацыянальнага мыслення проста немагчыма.

ІўсЁ ж сёлета я зноў паспрабую 9 мая. Віншаваць не буду — ведаю, што будзе ў адказ. Я проста пашлю ёй словы людзей, якія ведалі тую вайну. Тое, што мне расказвала мама (яе родная цётка), суседзі, аднавяскоўцы...

«Калі каму кажу, што вайну памятаю са сваіх двух гадоў, як толькі яна пачалася, — ніхто асабліва не верыць. А я памятаю, як нямецкія самалёты бамбілі Станькава, а мы з матуляй хаваліся ў беразе Усы. Зямля вакол калацілася, усё вакол гуло і завывала...»

«Прыйшлі ў хату немцы, забралі маму, павялі кудысьці. Мы з братам вельмі плакалі, баяліся, што мама не вернецца. Яна вярнулася ўвечары, плакала, расказвала дзеду, як яны пад аўтаматамі капалі магілу койданаўскім яўрэям, як яны яшчэ не паспелі адысці, а тых ужо пачалі расстрэльваць...»

«Была аблава, немцы па вёсцы шукалі партызан. Адзін, у чорным, з аўтаматам, забег да нас у хату. Мы з братам сядзелі на ложку, дарослых нікога не было. Немец наставіў аўтамат на нас. Мы адно да аднаго прыціснуліся і сядзелі як скамянелыя, нават паварушыцца не было сілы ад страху. А немец, нешта крыкнуўшы, паласнуў з аўтамата па столі ў нас над галовамі. Адтуль пасыпалася кастрыца, зацерушыла нам вочы. Мы з тыдзень нічога не бачылі — вочы апухлі і пяклі...»

«У апошні год вайны было зімой вельмі голадна. А ваўкі зграямі хадзілі вакол вёсак і накідваліся нават на людзей. Нашага сабаку з'елі каля ганку — толькі ланцуг застаўся... А вясной, як снег сышоў, мы хадзілі збіраць на полі пышкі — перамерзлую гнілую бульбу. Мама яе чысціла ад лупін і пякла аладкі. Сма-а-ачныя!..»

«Мы з маім Юстынам і дочкамі (адной два гады было, другой — тры) жылі ў яго бацькоў у Якутах. У той дзень немцы злосныя былі, хадзілі па вёсцы, шукалі партызан. Нікога не знайшлі, тады загадалі сабрацца ў цэнтры ўсім мужчынам, нібы для праверкі дакументаў. А там падзялілі іх, як на Страшным судзе: адных — па правую руку, другіх — па левую. Тых, хто справа стаяў, адпусцілі, тых, што злева, пастралялі, а пасля паскідвалі ў хлеў і падпалілі. Мой Юстынка злева стаяў... Я яго пасля адразу пазнала, ён не надта абгарэў. Пайшла па людзях прасіць, каб труну зрабілі, трэба ж пахаваць па-чалавечы. Не хоча ніхто, баяцца: раптам тыя нелюдзі вернуцца. Я тады прасцінку ў куфры чыстую знайшла, у прасцінку яго загарнула і на могілках сама закапала...»

«Як пачалі паліцаі паліць нашу хату, мы стаялі ды плакалі. А яны п'яныя былі. Мама да аднаго, якога ведала — ён з суседняй вёскі быў — кінулася прасіць: дазволь хоць што з хаты забраць, мы ж у чым былі стаялі. Той кіўнуў: ідзі. Мама толькі на ганак зайшла, а другі паліцай і секануў ёй з аўтамата ў спіну. Там на ганку яна і ўпала...»

«Мне трынаццаць гадоў было, як у Германію адправілі. Не паспела ўцячы, як моладзь хапалі... Завезлі кудысьці за Дзюсельдорф. Жыла ў хляве са свіннямі, ела з імі з карыта. Гаспадыня злосная была — увесь час біла і за валасы любіла цягаць. У мяне каса была — у вёсцы ўсе дзівіліся, з руку таўшчынёй. А вярнулася адтуль — амаль лысая...»

...Я абавязкова пашлю ёй гэтыя ўспаміны. Шчыра: я не ведаю, ці атрымаецца дастукацца да яе розуму і памяці. Дзеля чаго ж тады пісаць і пасылаць? Каб ведала і разумела, што ёсць іншая рэальнасць, дзе памятаюць і дагэтуль адчуваюць боль той вайны і ненавідзяць таму зробяць усё магчымае, каб ніколі больш не перажыць падобнага. Каб уявіла, як маленькі хлопчык — яе бацька — плача, выціраючы засыпаныя калючай кастрыцай вочы. Каб задумалася, каб хаця на хвіліну апрытомела і задумалася...

ЗРЭШТЫ, гэта патрэбна найперш і мне самой. А раптам штосьці здарыцца і з маімі сумленнем і памяццю? Ці з сумленнем і памяццю тых, хто прыйдзе пасля? Напісанае ж, кажуць, застаецца. Нават калі гэта не падручнік гісторыі.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Футбол вкуснее с Lay`s и Pepsi в Евроопт»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Футбол вкуснее с Lay`s и Pepsi в Евроопт» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Футбол вкуснее с Lay`s и Pepsi в Евроопт» (далее – Рекламная игра), разработанной в целях продвижения продукции, производимой под товарными знаками Lay's и Pepsi.

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

Игровой продукт – товар, выпускаемый под товарным знаком **«Lay's»**, и товар, выпускаемый под товарным знаком **«Pepsi»**, в упаковках, согласно перечню, указанному в п. 8 настоящих Правил.

Игровой код – это буквенно-цифровой код, состоящий из двух букв латинского алфавита (LP) и семи цифр, который присваивается участнику при соблюдении правил участия в Рекламной игре **«Футбол вкуснее с Lay`s и Pepsi в Евроопт»**.

Карта «Еплюс» – идентификатор (инструмент) участника бонусных программ «Еплюс» в виде:

- активной (незаблокированной) пластиковой бонусной карты «Еплюс» с нанесенным на ней уникальным идентификационным номером «Еплюс» (далее – Номер карты «Еплюс»), эмитированной заинтересованным лицом (ООО «Евроторг»), в том числе для функционирования бонусных программ «Еплюс»;

или – активной (незаблокированной) банковской платежной карты, выданной ОАО «СтатусБанк» в рамках банковского продукта «Статускарта», с нанесенным на ней Номером карты «Еплюс», в том числе для функционирования бонусных программ «Еплюс».

Текущий розыгрыш – каждый розыгрыш Рекламной игры, проходящий в установленную дату и время в соответствии с Правилами Рекламной игры.

1. Организатор Рекламной игры.

Организатором Рекламной игры является ООО «Яскрава», Республика Беларусь, УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 года решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191548102 (далее – Организатор).

Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, оф. 902.

Электронный адрес Организатора: lays@yaskrava.by.

2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является ИООО «ПепсиКо Продактс», Республика Беларусь, г. Минск, 220073, пер. 1-й Загородный, д. 20, каб. 24.

3. Участники Рекламной игры.

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. Члены комиссии не могут быть участниками Рекламной игры.

4. Наименование Рекламной игры: «Футбол вкуснее с Lay`s и Pepsi в Евроопт»

5. Территория проведения Рекламной игры: магазины «Евроопт», «Euroopt PRIME», магазины «Хит! Стандарт» и «Хит! Экспресс», находящиеся на территории Республики Беларусь, автомагазины «Евроопт», интернет-магазин edostavka.by.

6. Срок начала Рекламной игры: 10 мая 2023 года.

7. Срок окончания Рекламной игры: 10 июля 2023 года.

8. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.

Для участия в Рекламной игре необходимо приобрести не менее одного товара из Таблицы № 1 и не менее одного товара из Таблицы № 2 в одном кассовом чеке в период с 10 мая по 20 июня 2023 года включительно в любом из магазинов «Евроопт», «Euroopt PRIME», магазинов «Хит! Стандарт» и «Хит! Экспресс», находящихся на территории Республики Беларусь, автомагазинов «Евроопт», интернет-магазине edostavka.by, применив при расчете карту «Еплюс». За каждую такую пару присваивается 1 игровой код.

Таблица № 1. *Товар, выпускаемый под товарным знаком* ***Lay's (Лейз)****, далее – Игровой продукт:*

Код товара	Наименование товара
4690388108960	Чипсы Лейз Стакс (Lay's STAX) Королевский Краб, 140 г
4690388108977	Чипсы Лейз Стакс (Lay's STAX) Аромат Ребер Барбекю, 140 г
4690388108991	Чипсы Лейз Стакс (Lay's STAX) Нежная Сметана Лук, 140 г
4690388108946	Чипсы Лейз Стакс (Lay's STAX) Пикантная Паприка, 140 г
4690388108984	Чипсы Лейз Стакс (Lay's STAX) Сливочный Сыр, 140 г
4690388108953	Чипсы Лейз Стакс (Lay's STAX) Зеленый Лук, 140 г
4690388111274	Чипсы Лейз (Lay's) Краб, 140 г
4690388111250	Чипсы Лейз (Lay's) Сметана Зелень, 140 г
4690388111199	Чипсы Лейз (Lay's) Молодой Зеленый Лук, 140 г
4690388111441	Чипсы Лейз (Lay's) Сметана Лук, 140 г
4690388111380	Чипсы Лейз (Lay's) Белые Грибы со Сметаной, 140 г
4690388111359	Чипсы Лейз (Lay's) Сыр, 140 г
4690388111403	Чипсы Лейз (Lay's) с Солью, 140 г
4690388111465	Чипсы Лейз (Lay's) Рифленые Лобстер, 140 г
4690388095864	Чипсы Лейз (Lay's) Рифленые Лосось Сливочный Соус, 140 г
4690388111298	Чипсы Лейз (Lay's) Ребрышки Гриль, 140 г
4690388111427	Чипсы Лейз (Lay's) Паприка, 140 г
4690388101312	Чипсы Лейз (Lay's) Драники с мясом, 140 г
4690388095758	Чипсы Лейз (Lay's) Рифленые Паприка, 140 г
4690388103217	Чипсы Лейз (Lay's) Итальянские Колбаски, 140 г

Таблица № 2*. Товар, выпускаемый под товарным знаком* ***Pepsi (Пепси)****, далее – Игровой продукт:*

Код товара	Наименование товара
4810285013338	Напиток газированный б/а «Пепси (Pepsi)» ПЭТ, 1,0 л
4810285015561	Напиток газированный б/а «Пепси со вкусом Пина Колада (Pepsi Pina Colada taste)» ПЭТ, 1,0 л
4810285012782	Напиток газированный б/а «Пепси со вкусом мохито (Pepsi Mojito taste)» ПЭТ, 1,0 л
4810285010948	Напиток газированный б/а «Пепси со вкусом манго (Pepsi Mango taste)» ПЭТ, 1,0 л
4810285009782	Напиток газированный б/а «Пепси Макс (Pepsi MAX)» ПЭТ, 1,0 л

9. Призовой фонд Рекламной игры.

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Заинтересованного лица **(ИООО «ПепсиКо Продактс»)** в размере **136 472,14** (сто тридцать шесть тысяч четыреста семьдесят два) белорусских рубля 14 копеек. Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

Таблица № 3. *Призовой фонд Рекламной игры.*

